Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці прадстаўляе дакументальны праект

# Арлянаты

*“У дні тыя мы вайной не гулялі - мы дыхалі проста вайной”*

Выстава прымеркавана да гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Экспазіцыя прадстаўлена матэрыяламі з калекцыі дакументаў з успамінамі ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і тэкстамі артыкулаў пра юных патрыётаў Віцебшчыны, апублікаваных у газеце «Віцебскі рабочы» ў 1987 годзе.

# Браты Кудраўцавы




Братья Кудрявцевы

## БРАТЫ КУДРАЎЦАВЫ



Віктар КУДРАУЦАУ



Іван КУДРАУЦАУ

Расонская школа дала нямала герояў Вялікай Айчыннай вайны. Іван і Віктар Кудраўцавы таксама выхаванцы гэтай школы. Тут жа працаваў і бацька, які пайшоў на фронт у самым пачатку вайны і загінуў у 1943 годзе пры вызваленні горада Вялікія Лукі.

Дзеці засталіся з маці і спаўна зведалі, што такое вайна, што такое гітлераўскі «новы парадак». Яны ўвесь час марылі толькі аб адным — пайсці ў партызанскі атрад. Але камандзір атрада імя Калініна С. С. Гаўрыленка, якому рабяты перадалі некалькі вінтовак і каля сотні вучнёўскіх сшыткаў, раіў рабятам падрасці.

Толькі ў верасні 1942 года, калі Івану было пятнаццаць гадоў, яго залічылі ў партызанскі атрад. Малодшы з братоў працягваў араць зямлю, вырошчваць хлеб і вазіць яго на склады партызанскай брыгады імя Сталіна. Выконваў піянер і іншыя даручэнні партызан. У атрад Віктар трапіў на год пазней за свайго брата.

Баявыя партызанскія будні братоў Кудраўцавых — гэта і няспынныя баі, і доўгія пераходы, і ўдзел у засадах. Але ніколі не скардзіліся юныя патрыёты на цяжкасці: аб іх не было часу і думаць. Рабяты стараліся выконваць свае партызанскія абавязкі як мага лепш.

Браты Кудраўцавы ўдзельнічалі ў «рэйкавай вайне». Аднойчы пры падыходзе да чыгункі ў раёне вёскі Клясціцы Іван улавіў нейкі шум у хмызняку. Калі падабраўся бліжэй, то ўбачыў вартавога, які спаў, і зямлянку, у якой адпачывала варта чыгуначнага ўчастка. З вартавым расправіўся хутка, а ў зямлянку кінуў адразу дзве гранаты. Было забіта дзесяць гітлераўцаў. Аперацыя на чыгунцы прайшла паспяхова, рух быў перапынены на доўгі час.

Ніколі не забудзецца бой на рацэ Дрыса ў 1943 годзе. У гэты час гітлераўскае камандаванне правяло чарговую карную экспедыцыю супраць партызан Расонскай зоны. Войскі Чырвонай Арміі набліжаліся, і акупанты спяшаліся абясшкодзіць шляхі адступлення, ачысціць мясцовасць ад партызан. Атрад імя Калініна трымаў абарону ля вёскі Краснаполле. Удар карнікі наносілі ўздоўж шасэ.

Камандзір атрада загадаў: «Падпускаць ворага бліжэй, ніводнага патрона не расходаваць дарэмна!». Калі адлегласць паміж партызанскай абаронай і наступаўшымі скарачалася да 100—200 метраў, партызаны адкрывалі агонь з усіх відаў зброі. Усе намаганні гітлераўцаў прарваць абарону партызан аказаліся дарэмнымі. Яны вымушаны былі адысці і больш на гэтым участку не наступалі.

Віктар Кудраўцаў успамінае таксама засаду на шасэ Невель — Расоны ў кастрычніку 1943 года, у якой ён удзельнічаў. Тады было знішчана да роты нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іх прыслужнікаў. У лістападзе 1943 года Віктар захварэў тыфам і трапіў у шпіталь.

Апошні бой Івана Кудраўцава ў радах народных мсціўцаў быў за вёску Дворышча. Партызанскі атрад імя Калініна і гвардзейская рота на працягу гадзіны выбілі гітлераўцаў з вёскі, захапілі вялікія трафеі. Гэта былі радасныя дні.

Пасля злучэння з часцямі Чырвонай Арміі Іван Кудраўцаў служыў у войсках НКУС, удзельнічаў у аперацыях па знішчэнню фашыстаў, паліцэйскіх і іншых прыслужнікаў ворага, якія засталіся ў лясах на тэрыторыі Віцебскай вобласці, Літоўскай ССР.

У снежні 1944 года быў прыняты ў камсамол і праслужыў у войсках НКУС да канца вайны.

У 1947 годзе паступіў у афіцэрскае вучылішча, якое скончыў з адзнакай у 1950 годзе. Праслужыў у радах Савецкай Арміі 32 гады.

Цяпер Іван Савельевіч Кудраўцаў жыве ў Мінску. На пенсіі. Але не хоча ветэран сядзець без справы і працягвае працаваць выхавальнікам у маладзёжным інтэрнаце.

І. С. Кудраўцаў узнагароджан медалямі «За баявыя заслугі», «Партызану Айчыннай вайны» II ступені, «За выдатную ахову грамадскага парадку» і іншымі.

Віктар Савельевіч Кудраўцаў узнагароджаны медалямі «За адвагу», юбілейнымі, многімі граматамі. Ён камуніст. Працуе загадчыкам аддзела цэн выканкома Віцебскага абласнога Савета народных дэпутатаў.

ДАВц. Ф. 9742-п. Воп. 6. Спр. 45. Арк. 85.

<u>Віктар і Іван Кудраўцавы</u>

Віктар і Іван былі выхаванцамі расонскай школы, у якой працаваў іх бацька, што загінуў на фронце ў 1943 г. Браты засталіся з маці і ўвесь час марылі пра тое, каб пайсці ў партызанскі атрад. Калі Івану споўнілася 15 гадоў, ён далучыўся да партызанаў атрада імя Калініна. Малодшы ж брат працягваў апрацоўваць зямлю і вырошчваць хлеб. У партызанскі атрад ён трапіў толькі ў 1943 г., праз год пасля таго, як там апынуўся яго старэйшы брат.

Партызанскія будні братоў былі напоўнены безупыннымі баямі, удзелам ў «рэйкавай вайне» і іншымі аперацыямі.

Паказальным стаў бой на р. Дрыса ў 1943 г. супраць гітлераўскіх акупантаў, якія праводзілі чарговую карную экспедыцыю. Калі адлегласць паміж партызанскай абароннай і наступаючымі сіламі скарацілася да 100-200 метраў, партызаны адкрылі агонь з усіх відаў зброі і адкінулі ворага з гэтага ўчастка.

Віктар успамінае засаду на шашы Невель-Расоны ў кастрычніку 1943 г., падчас якой было знішчана каля роты нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іх прыслужнікаў. Гэтай жа восенню Віктар захварэў тыфам і трапіў у шпіталь.

Апошні бой Івана ў шэрагах народных мсціўцаў адбыўся за вёску Дворышча. Населены пункт быў адбіты ў гітлераўцаў за адну гадзіну. Пасля злучэння з часцямі Чырвонай Арміі Іван служыў у войсках НКУС да канца вайны, браў удзел ў аперацыях па знішчэнні ворага і яго памагатых, якія засталіся ў лясах на тэрыторыі Віцебшчыны і Літоўскай ССР.

Іван Кудраўцаў узнагароджаны медалямі “За баявыя заслугі”, “Партызану Айчыннай вайны II ступені”, “За выдатную ахову грамадзянскага парадку” і інш.

Віктар Кудраўцаў мае граматы і медалі “За адвагу”, юбілейныя і інш.

# Шлях ляжаў на Берлін



Владимир Шуронин

## ШЛЯХ ЛЯЖАЎ НА БЕРЛІН

Валодзя Шуронін нарадзіўся ў 1933 годзе ў вёсцы Піцяры Гарадоцкага раёна. Хлапчуку ішоў восьмы год, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна. Ён памятае, як у запыленых гімнасцёрках праходзілі па вёсцы савецкія воіны, як яны адбівалі ярасныя атакі гітлераўцаў. Стрымаць ворага ім не ўдалося, і неўзабаве мясцовасць, дзе жыў Валодзя, была акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Ды не маглі скарыцца акупантам савецкія людзі. У Піцярах сталі паяўляцца партызаны. Старэйшы брат Валодзі аднойчы сказаў бацькам:

— Іду ў партызанскі атрад.

Бацькі не пярэчылі, бо ведалі, што сын інакш не можа, што сэрца яго гарыць помстай да акупантаў, якія прынеслі ў кожны дом гора і пакуты.

Брат быў падрыўніком. Нярэдка прыязджаў дадому і вучыў падрыўной справе Валодзю.

У 1944 годзе бацькі хлопчыка былі расстраляны гітлераўцамі, і ён застаўся сіратой. «Што рабіць? Куды падацца?» — гэтыя думкі не давалі спакою. Рашэнне прыйшло нечакана. Непадалёку размяшчалася воінская часць, і хлопчык рашыў папрасіцца, каб узялі сынам палка.

Неўзабаве Валодзя стаяў перад камандзірам 188-га асобнага сапёрнага батальёна 5-й танкавай дывізіі.

— Дык, кажаш, знаёмы з падрыўной справай? — перапытаў камандзір. — Такія людзі нам патрэбны. Толькі братавай навукі, відаць, будзе недастаткова. Давядзецца перавучвацца.

Хлопчык тут жа запэўніў, што будзе старанна вывучаць усё, што патрэбна байцу Чырвонай Арміі. Самае страшнае для яго было адно: а раптам не возьмуць з-за малога ўзросту.

Вайсковы кравец сшыў Валодзю Шуроніну новенькую форму. Яго залічылі ва ўзвод мінёраў-падрыўнікоў.

Работа была небяспечная. Нездарма гавораць, што сапёр памыляецца толькі адзін раз. Але Валодзя ўжо быў добрым спецыялістам. Ён ведаў і свае, і нямецкія міны, лёгка знаходзіў іх на мінным полі.

Шмат разоў прабіраўся хлопчык разам з баявымі сябрамі да мастоў, якія павінны былі ўзляцець у паветра. Ён асабліва любіў назіраць, як ад варожага эшалона, які вёз смертаносны груз на нашу зямлю, заставалася толькі груда абгарэлага металу.

Нярэдка даводзілася ўступаць у бой з гітлераўскімі акупантамі. У такіх выпадках Валодзя дзейнічаў смела і рашуча.

Камандзір батальёна не раз пасылаў хлопчыка ў тыл праціўніка. Тут ужо вайсковую форму прыходзілася знімаць. Апрануўшыся ў лахманы, Валодзя пад выглядам жабрака хадзіў у вёскі, дзе размяшчаліся гітлераўцы, запамінаў, колькі там баявой тэхнікі, дзе ўзведзены абарончыя ўмацаванні. Такія звесткі вельмі патрэбны былі нашаму камандаванню.

Са сваёй часцю Валодзя Шуронін дайшоў да Берліна. Колькі радасці было, калі аб'явілі, што гітлераўская Германія капітулявала. Свой уклад у перамогу над ворагам унёс і ён, дванаццацігадовы хлопчык.

За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, Валодзя Шуронін узнагароджан медалямі «За адвагу» і «За перамогу над Германіяй».

У пасляваенны час Уладзімір Цімафеевіч Шуронін служыў у Ваенна-Марскім Флоце. Ваенная спецыяльнасць была ранейшай — мінёр. Толькі службу праходзіў не на зямлі, а на караблі-тральшчыку.

Цяпер У. Ц. Шуронін жыве ў Віцебску, працуе на камбінаце будаўнічых матэрыялаў.

ДАВц. Ф. 9742-п. Воп. 6. Спр. 45. Арк. 85.

Уладзімір Шуронін

Калі пачалася вайна, Вове ішоў восьмы год. Ён бачыў, як па яго вёсцы праходзілі савецкія салдаты. Неўзабаве, месца, дзе жыў хлопчык было акупавана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У вёсцы сталі з'яўляцца партызаны. Неўзабаве да іх далучыўся старэйшы брат Вовы.

У 1944 г. браты засталіся сіротамі. Непадалёк ад роднай вёскі размяшчалася вайсковая частка, і Вова вырашыў папрасіцца ў яе сынам палка. Паколькі хлопчык быў знаёмы з падрыўной дзейнасцю, якой яго навучыў старэйшы брат, сірату хутка залічылі ва ўзвод мінёраў-падрыўнікоў 188-ы асобны сапёрны батальён.

Праца была небяспечнай, Валодзя ўжо быў добрым спецыялістам, ведаў свае і нямецкія міны, лёгка знаходзіў іх на мінным полі. Неаднаразова камандзір батальёна адпраўляў хлопчыка ў тыл праціўніка, дзе Вова ў вобразе жабрака хадзіў па вёсках і запамінаў, дзе размяшчаюцца гітлераўцы, колькасць баявых машын і інш.

Дванаццацігадовы хлопчык, які са сваёй часткай дайшоў да Берліна, за мужнасць і адвагу, праяўленыя а баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, быў узнагароджаны медалямі “За адвагу”, “За перамогу над Германіяй”.

# Каб вырвацца з варожага кальца...

Иосиф Булавский

## Каб вырвацца з варожага кальца...

З першых мінут Вялікай Айчыннай вайны піянер Іосіф Булаўскі зведаў яе жахі. І гэта зразумела: яго бацька Іван Раманавіч працаваў да вайны старшынёй выканкома раённага Савета дэпутатаў працоўных у мястэчку Шэрашава, непадалёку ад Брэста. Дванаццацігадовы Іосіф разам з маці, братамі і сястрой адчулі на сабе ўсю горыч першых дзён ваеннага ліхалецця.

З Шэрашава ў сваю родную вёску Зерчаніца Ушацкага раёна сям'я Булаўскіх дабралася ўжо тады, калі яна была занята гітлераўскімі акупантамі.



Іосіф праяўляў зайздросную вытрымку і смеласць.

У сакавіку 1942 года бацька Іосіфа, пазней другі сакратар Лепельскага падпольнага райкома партыі, вывез сям'ю ў партызанскую зону ў вёску Антунова. А 14 лютага 1943 года ён загінуў пры выкананні баявога задання. Іосіф пакляўся адпомсціць акупантам за гібель бацькі. І клятву сваю ён стрымаў.

Смелага і мужнага трынаццацігадовага хлапчука залічылі ў каменданцкі ўзвод партызанскай брыгады імя Сталіна. Падлетку не раз разам са старэйшымі баявымі сябрамі даводзілася ўдзельнічаць у адкрытых баях з фашысцкімі карнікамі. І заўсёды

Асабліва цяжкае становішча склалася для групы партызан, у якой знаходзіўся Іосіф, у маі 1944 года, у час адной з самых цяжкіх аперацый пры выхадзе з гітлераўскага акружэння ў раёне вёскі Окана. Фашысты раз за разам атакавалі партызан, але народныя мсціўцы сустракалі іх дружным агнём. Пакідаючы на полі бою забітых, гітлераўцы адступалі, але затым зноў узнімаліся ў новую атаку. Нямала іх знайшло сабе магілу ў гэтым баі і ад трапных выстралаў піянера Іосіфа Булаўскага.

Нягледзячы на тое, што гітлераўцы ў гэтым баі мелі значную перавагу ў людской сіле і тэхнічным аснашчэнні, пацясніць партызан ім не ўдалося.

Удзельнічаў Іосіф і ў найцяжэйшым баі ў раёне возера Палік пры прарыве партызан з варожага акружэння. Бой працягваўся бесперапынна з паўночы да світання і закончыўся разгромам акупантаў на гэтым участку. Аднак і Іосіф у гэтым баі быў паранены.

Пасля злучэння партызан з войскамі Чырвонай Арміі ў чэрвені 1944 года Іосіф знаходзіўся на лячэнні ў ваенным шпіталі, а пасля выздараўлення вярнуўся ў родныя мясціны. Скончыў курсы механізатараў. Пасля службы ў Савецкай Арміі і па сённяшні дзень працуе механізатарам у калгасе «XXI з'езд КПСС», жыве ў вёсцы Селішча Ушацкага раёна, непадалёку ад мемарыяльнага комплексу «Прарыў».

За заслугі перад Радзімай Іосіф Булаўскі ўзнагароджан пяццю медалямі.

ДАВц. Ф. 9742-п. Воп. 6. Спр. 45. Арк. 80.

Іосіф Булаўскі

Родная вёска Іосіфа Булаўскага – Шарашова – была занятая фашыстамі ў першыя дні вайны. Бацька сямейства, Іван Раманавіч, у 1942 г. вывез сваіх родных у партызанскую зону ў вёску Антунова. А калі бацька загінуў пры выкананні баявога задання, Іосіф пакляўся адпомсціць акупантам. І клятву сваю ён стрымаў.

Смелага 13-гадовага хлапчука залічылі ў каменданцкі ўзвод партызанскай брыгады імя Сталіна. Не раз Іосіф удзельнічаў разам са сваімі баявымі таварышамі ў адкрытых баях.

У 1944 г. група партызан, у якой знаходзіўся Іосіф, была задзейнічана ў самай складанай аперацыі пры выхадзе з нямецкага акружэння ў раёне вёскі Окана. Раз за разам атрад партызан апыняўся пад агнём. Нягледзячы на колькасную і тэхнічную перавагу ворага, выцесніць партызан яму не ўдалося.

Яшчэ адным цяжкім боем было сутыкненне з немцамі ў раёне возера Палік, якое скончылася для Іосіфа раненнем. Пасля выздараўлення ў 1944 г. хлопчык вярнуўся ў родныя мясціны.

За свае заслугі Іосіф Булаўскі быў узнагароджаны пяццю медалямі.

# Верны піянерскай клятве



Коля Городецкий

## Верны піянерскай клятве

Да чатырнаццаці год Коля арадзецкі жыў у лясной вёсцы Іванаўка на Сенненшчыне. олькі паспеў скончыць шэсць ласаў Задарожскай школы, як ачалася Вялікая Айчынная айна.

«Коля быў вельмі дапытлівым, энергічным і смелым хлопыкам, — успамінае яго сястра інаіда Віктараўна Гарадзецая, настаўніца школы № 25 Віцебска. — Бацькі, школа, іянерская дружына выхавалі го сумленным чалавекам, які меў сябраваць са сваімі равесікамі і даражыць дружбай».

Асабліва Коля быў у сяброўкіх адносінах са сваім старэйым па ўзросту земляком камамольцам Пецем Лебедзевым. першыя ж дні вайны, як олькі часці Чырвонай Арміі дышлі на ўсход, Пеця Лебедзеў і Коля выявілі непадалёку сваёй вёскі ў лесе яму са хаванай у ёй зброяй і боепрыасамі. Гадзіны за тры яны аспелі частку знойдзеных вінвак і патроны перахаваць у адзейнае месца за балотам, а невялікім востраве Барсуына.

На наступны дзень каля адго з акопаў Пеця і Коля айшлі станкавы кулямёт Максім» з зараджанымі стужмі да яго. Гэту знаходку яны капалі за могілкамі.

Захапіўшыся пошукам зброі, а тры-чатыры дні хлапчукі сабралі яшчэ два ручныя кулямёты, каля 30 вінтовак, некалькі рэвальвераў, пісталетаў і больш сотні гранат. У асноўным усю зброю яны схавалі ў розных месцах і старанна замаскіравалі. Сабе ж пакінулі ручны кулямёт, па вінтоўцы, па пісталету і некалькі гранат. Юныя смельчакі думалі цяпер, як знайсці людзей, якім можна было б перадаць зброю для барацьбы з акупантамі. А пакуль такіх людзей яны не сустрэлі, то рашылі самі выпрабаваць у дзеянні супраць захопнікаў ручны кулямёт.

Дэталёва абдумаўшы ўсё, прасядзелі два дні ў засадзе каля бальшака Сянно—Віцебск. Нарэшце на дарозе ўбачылі машыну з гітлераўцамі. Як і дамовіліся загадзя, Пеця застрачыў па ёй з кулямёта, а Коля кінуў у машыну гранату, папаўшы пад пярэдняе кола. Кулямётнай чаргой і ўзрывам гранаты быў забіт гітлеравец, які сядзеў за рулём. Ён, як сноп,ываліўся з машыны. Другі быў ранены і, нават не адстрэльваючыся, уцёк у лес. З пісталета Коля прастрэліў бензабак, а Пеця падпаліў аўтамашыну. У якасці трафеяў яны забралі вінтоўку і аўтамат з патронамі.

Летам 1942 года юныя мсціўцы перадалі сабраную імі зброю і боепрыпасы праслаўленым ужо тады партызанам брыгады «Аляксея», пакінуўшы сабе па пісталету, а Коля яшчэ ўзяў і трафейны аўтамат.

Восенню 1943 года моладзь вёскі Іванаўка ўходзіла ў партызаны. Коля таксама хацеў пайсці, а яго не ўзялі па ўзросту. Але не такога ёч быў характару, каб адмовіцца ад сваёй задумы змагацца з ворагам. Коля дабіўся свайго: яго залічылі ў атрад № 10 партызанскай брыгады П. І. Кірылава.

Адважны піянер і ў партызанскім атрадзе храбра ваяваў з ворагам. Незадоўга да выгнання фашысцкіх захопнікаў з Віцебшчыны група партызан трапіла ў акружэнне. Коля прыняў апошні для сябе бой, адстрэльваючыся ад насядаўшых карнікаў да апошняга патрона.

Верны партызанскай прысязе і піянерскай клятве, Коля Гарадзецкі загінуў як герой.

ДАВц. Ф. 9742-п. Воп. 6. Спр. 45. Арк. 81.

Коля Гарадзецкі

Энергічны, смелы, дапытлівы Коля Гарадзецкі толькі паспеў скончыць шосты клас, як пачалася вайна.

У першыя дні вайны, як толькі Чырвоная Армія адышла на ўсход, Коля разам са сваім сябрам Пецем Лебедзевым знайшлі ў лесе схаваныя зброю і боепрыпасы і перахавалі скарб за балотам. На наступны дзень гісторыя паўтарылася.

Хлопчыкі былі захопленыя пошукамі зброі і за некалькі дзён сабралі яшчэ два ручных кулямёта, каля 30 вінтовак, некалькі рэвальвераў, пісталетаў, сотні гранат і інш. Перад юнымі храбрацамі стаяла пытанне, як знайсці людзей, якім можна перадаць усю зброю. А пакуль шукалі, вырашылі самі выпрабаваць на захопніках гэтую прыладу.

Улетку 1942 г. юныя мсціўцы перадалі сабраную зброю і боепрыпасы партызанам брыгады “Аляксея”. У 1943 г. Колю, не гледзячы на ўзрост, залічылі ў атрад № 10 партызанскай брыгады П. І. Кірылава, дзе ён адважна ваяваў з ворагам.

Апошні бой Коля прыняў незадоўга да выгнання немцаў з тэрыторыі Віцебшчыны, да канца адстрэльваючыся ад карнікаў, якія насядалі на яго, і загінуў як герой, верны партызанская прысязе і піянерскай клятве.

# Ад Себежа да Берліна

# Арляняты

Дмитрий Зубарь

## АД СЕБЕЖА ДА БЕРЛІНА



Нарадзіўся Дзіма Зубар і жыў да Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы Стрэлкі на Верхнядзвіншчыне. У 1941 годзе скончыў 7 класаў Стрэлкаўскай школы. Бацька Дзімы Аляксандр Максімавіч працаваў калгасным кавалём.

Піянерская дружына і працоўная сям'я, у якой рос Дзіма, выхавалі яго патрыётам сваёй Радзімы. Сярод хлопчыкаў-равеснікаў Дзіма выдзяляўся кемлівасцю і смеласцю.

З нападам на нашу родную зямлю фашысцкіх захопнікаў сэрца юнага патрыёта напоўнілася болем і гневам. Ён быў упэўнены, што гітлераўскія акупанты доўга не затрымаюцца, а каб хутчэй прыйшоў гэты дзень, трэба быць гатовым да актыўнай барацьбы з ненавісным ворагам.

Зімой 1942 года Дзіма сустрэўся са сваім настаўнікам Уладзімірам Іосіфавічам Вестынбергам, актыўным удзельнікам Прошкаўскага камсамольска-маладзёжнага падполля. К гэтаму часу ў Дзімы ўжо было прыхавана некалькі вінтовак, аб чым ён і расказаў У. І. Вестынбергу. Папярэдзіўшы Дзіму аб асцярожнасці, настаўнік прапанаваў яму збіраць зброю на месцы баёў за ўрочышчам Вуглы.

Для выканання гэтага задання Дзіма арганізаваў са сваіх аднакласнікаў піянерскае звяно, у якое ўвайшлі Коля Казачонак, Лёша Пацалуёнак і Ваня Казачонак. Пад кіраўніцтвам Дзімы рабяты ўжо пад снегам адшукалі два кулямёты, чатыры аўтаматы, больш дзесяці вінтовак і схавалі іх у абсталяваным імі тайніку.

У адзін з зімовых вечароў у вёску Стрэлкі прыехаў на падводзе У. І. Вестынберг з двума падпольшчыкамі. Яны зайшлі ў дом да Зубараў і тут даведаліся, што ў вёсцы знаходзяцца гітлераўцы і паліцаі з нарабленымі ў насельніцтва маёмасцю і прадуктамі харчавання.

Падпольшчыкі прынялі рашэнне правучыць фашысцкіх марадзёраў, каб ім надалей не панадна было грабіць савецкіх людзей. Суправаджаць народных мсціўцаў узяўся Дзіма. Ён правёў іх непрыкметна да дома, у якім спыніліся гітлераўцы. На вуліцы каля дома аказаўся вартавы, які ахоўваў аўтамашыну з нарабленым дабром. Падпольшчыкі бясшумна абяззброілі вартавога і ўвайшлі ў дом. У хаце яны з удзелам Дзімы захапілі пяцярых акупантаў на чале з фельдфебелем, а на вуліцы затрымалі двух паліцэйскіх.

Нарабленыя рэчы, што знаходзіліся на аўтамашыне, былі раздадзены іх уладальнікам.

У сакавіку 1943 года Дзіма пайшоў у партызанскі атрад «Бальшавік» Першай Калінінскай брыгады, удзельнічаў у баявых аперацыях супраць карнікаў. У адным з баёў быў паранены, а пасля вылячэння зноў вярнуўся ў строй і змагаўся ў партызанскіх радах да выгнання гітлераўцаў з горада Себежа. Пасля быў мабілізаваны ў дзеючую армію, удзельнічаў у вызваленні Беларусі і Польшчы, дайшоў з баямі да Берліна. Напярэдадні дня Перамогі быў другі раз цяжка паранены.

Пасля вайны Дзмітрый Аляксандравіч Зубар увесь час працуе ў сельскай гаспадарцы. Цяпер з'яўляецца галоўным інжынерам і намеснікам старшыні калгаса «Зара» Верхнядзвінскага раёна.

За заслугі перад Радзімай Д. А. Зубар узнагароджан многімі медалямі.

ДАВц. Ф. 9742-п. Воп. 6. Спр. 45. Арк. 82.

Дзмітрый Зубар

У 1941 г. Дзіма Зубар толькі скончыў сёмы клас. Смелы і кемлівы юны патрыёт быў упэўнены, што акупанты надоўга не затрымаюцца, таму варта быць гатовым да актыўнай барацьбы з ненавісным ворагам. Звязаўшыся з удзельнікамі Прошкаўскага камсамольска-маладзёжнага падполля, Дзіма разам со сваімі аднакласнікамі арганізавалі піянерскае звяно, якое займалася пошукам зброі. Аднойчы ў роднай вёсцы Стрэлкі удзельнічаў у захопе акупантоў, займаўшыхся рабаўніцтвам.
У сакавіку 1943 г. Дзіма ўвайшоў у склад партызанскага атрада "Бальшавік" першай Калінінскай брыгады і ўдзельнічаў у шматлікіх баявых дзеяннях. У адным з баёў быў паранены, але пасля зноў вярнуўся ў партызанскі атрад, а затым быў мабілізаваны ў Чырвоную Армію. Удзельнічаў у вызваленні Беларусі і Польшчы, дайшоў да Берліна.
За заслугі перад Радзімай Д. Зубар узнагароджаны многімі медалямі.

# Трафеі з поля бою



## Трафеі з поля бою

Да Вялікай Айчыннай вайны Валодзя Магучы скончыў шэсць класаў Прысушынскай школы былога Суражскага раёна.

З болем у сэрцы сустрэў хлопчык вестку аб тым, што на нашу зямлю насоўваецца фашысцкая навала. Ён добра памятае, як праводзіла вёска на фронт бацькоў, сыноў, старэйшых братоў. Музыка, плач жанчын, словы-наказы, словы развітання...

Неўзабаве фронт прыйшоў і сюды, у родныя мясціны. Цяжкія баі з акупантамі, параненыя савецкія воіны на пыльных вясковых дарогах, гітлераўцы на матацыклах.

Калі фронт адкаціўся на ўсход, дапытлівыя хлапчукі пачалі шныраць па месцах былых баёў. Знаходзілі нашы і нямецкія вінтоўкі, аўтаматы, патроны і надзейна хавалі ў патаемных месцах.

Адчойчы зімою Валодзя і яго сябры знайшлі ў лесе савецкія лістоўкі, відаць, скінутыя з самалёта. Яны прынеслі іх у вёску, перадалі блізкім, надзейным людзям.

Брат Міхаіл, стаўшы партызанам, пачаў даваць Валодзю заданні. Хлопчык пранікаў у варожыя гарнізоны, сачыў за перамяшчэннем гітлераўцаў.

У 1943 годзе ў час лютаўска-сакавіцкай карнай экспедыцыі Валодзя Магучы прымаў удзел у баявых дзеяннях, хадзіў у атаку на прарыў варожага кальца. У адным з баёў перад юным патрыётам раптам вырасла фігура акупанта. На роздум заставаліся долі секунды. Хлопчык не разгубіўся і імгненна націснуў на курок карабіна. Гітлеравец войкнуў і, як мяшок, паваліўся ў снег.

У маі 1943 года Валодзю паклікаў да сябе камандзір атрада А. А. Пагарэлаў.

— Ёсць вельмі адказнае заданне, — сказаў ён. — У вёсцы Прысушына — варожы гарнізон. Трэба непрыкметна пранікнуць туды і сабраць звесткі аб жывой сіле і тэхніцы праціўніка, размяшчэнні абаронных збудаванняў. Словам, нас цікавіць усё, што робіцца ў гарнізоне. Будзь толькі асцярожным...

Хлопчык быў бязмежна рады, што атрымаў заданне ад самога камандзіра атрада, і неадкладна адправіўся ў дарогу. Заданне А. А. Пагарэлава было выканана паспяхова.

Пазней Валодзя неаднаразова хадзіў у разведку, прыносіў у атрад важныя звесткі, чым заслужыў не адну падзяку ад партызанскіх камандзіраў.

У канцы лета юнаму патрыёту зноў давялося тварам у твар сутыкнуцца з гітлераўскімі акупантамі. У баі Валодзя дзейнічаў смела і рашуча. Нароўні з дарослымі ён касіў з карабіна чужынцаў. Баявыя сябры сказалі яму многа пахвальных слоў, калі ён паказаў пасля бою свае трафеі — аўтамат і дзве гранаты.

У пасляваенны час Валодзя Магучы працаваў трактарыстам, брыгадзірам трактарнай брыгады Суражскай МТС. Затым быў накіраваны на работу ў Ружанскую МТС Брэсцкай вобласці. У 1957 годзе скончыў Журавіцкі сельскагаспадарчы тэхнікум, затым — Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію.

Цяпер член КПСС Уладзімір Апанасавіч Магучы працуе галоўным інжынерам упраўлення мясцовай прамысловасці Віцебскага аблвыканкома.

ДАВц. Ф. 9742-п. Воп. 6. Спр. 45. Арк. 83.

<u>Валодзя Магучы</u>

Пасля Вялікай Айчынай вайны фронт прыйшоў і ў родныя мясціны Валодзі, прымусіўшы дапытлівых хлопчыкаў шукать зброю і боепрыпасы на месцах былых баёў.

Стаўшы партызанам, старэйшы брат Валодзі пачаў браць яго з сабой на розныя аперацыі. Хлопчык пранікаў у варожыя гарнізоны, сачыў за перамяшчэннем нямецкай тэхнікі.

У 1943 г. падчас лютаўска-сакавіцкай карнай экспедыцыі Вова ўжо прымаў удзел у баявых дзеяннях, хадзіў у разведку, прыносячы ў атрад важныя дадзеныя, чым заслужыў не адну падзяку ад партызанскіх камандзіраў.

# Як вогненны метэор

## ЯК ВОГНЕННЫ МЕТЭОР



Пра піянера Юліка Кошку — вучня Сорзаўскай пачатковай школы, што на Ушаччыне, расказаў былы настаўнік школы, а ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны камісар Лепельскай партызанскай брыгады, сакратар Лепельскага падпольнага райкома КП Беларусі У. Л. Качан.

Ужо ў школьныя гады Юлік выдзяляўся сярод сваіх аднакласнікаў цвёрдым характарам, смеласцю і прыроднай кемлівасцю. За гэта ён быў прызнаным важаком равеснікаў.

У маі—чэрвені 1943 года гітлераўцы праводзілі карную экспедыцыю супраць партызан Лепельска-Ушацкай зоны. У адным з абарончых баёў партызаны замацаваліся на заходнім беразе безыманнай рачулкі паміж азёрамі Лучыла і Мурогі, а гітлераўцы знаходзіліся на процілеглым. Улічваючы складанасць абстаноўкі на гэтым участку, сакратар падпольнага райкома партыі У. Л. Качан знаходзіўся іменна тут, сярод партызан атрада № 3, якім камандаваў Дзмітрый Караленка.

Вось у гэты час нечакана і сустрэўся былы настаўнік са сваім вучнем Юлікам Кошкам. Юны партызан паведаміў старэйшаму таварышу, што ў атрадзе № 3 ён з чэрвеня 1942 года, з'яўляецца разведчыкам. А як толькі пачалася вайна, ён арганізаваў сваіх аднакласнікаў для збору зброі.

Камандзір атрада Дзмітрый Караленка расказаў, што юны разведчык Юлік Кошка вельмі адважны і баявы хлопец. Ён часта хадзіў з партызанамі на чыгунку, падрываў рэйкі і эшалоны, падпальваў масты. Удзельнічаў у рэйдзе па тылах праціўніка ў саставе групы партызан. Нямала захопнікаў знайшло сабе магілу ад трапных выстралаў Юліка з бясшумнай вінтоўкі.

Напярэдадні сустрэчы з У. Л. Качаном Юлік хадзіў у разведку ў размяшчэнне ворага. Перад ім была пастаўлена задача — высветліць найбольш слабае месца ў абароне праціўніка. Прайшоў некаторы час, і партызаны атрада пачулі стрэлы з аўтаматаў, якія даносіліся з боку абароны праціўніка. Праз некаторы час паявіўся Юлік, стомлены, мокры, але радасны. Ён нёс тры трафейныя аўтаматы і патроны да іх.

Як расказаў Юлік, вяртаючыся з разведкі, ён нечакана натыкнуўся на трох гітлераўскіх афіцэраў, якія сядзелі ля вогнішча ў лесе. Не разгубіўшыся, ён з аўтамата расстраляў іх і захапіў з сабой іх зброю.

Аднак для прарыву варожай абароны спатрэбілася яшчэ ўдакладніць некаторыя дэталі, а пры магчымасці — узяць «языка». І камандаванне рашыла паслаць у разведку цэлую групу. Праявіўшы настойлівасць, Юлік дабіўся дазволу камандавання на ўключэнне яго ў групу смельчакоў.

На наступны дзень партызаны-разведчыкі прабраліся да штаба нямецкай воінскай часці, які размяшчаўся ў палатцы. Юліку трэба было асцярожна прабрацца туды і захапіць штабныя дакументы. Але ў палатцы аказаліся немцы, якіх юны партызан знішчыў чаргой з аўтамата. Здавалася, мэта блізкая. Аднак адзін з гітлераўцаў знаходзіўся ў гэты момант непадалёку ад штабной палаткі і, заўважыўшы Юліка, разрадзіў свой аўтамат у юнага партызана.

Так абарвалася кароткае, але гераічнае жыццё піянера-патрыёта, які беззапаветна любіў сваю сацыялістычную Радзіму. Пазней пра Юліка Кошку яго былы настаўнік і камісар брыгады У. Л. Качан сказа: «Яго кароткае жыццё блiснула як вогненны метэор».

ДАВц. Ф. 9742-п. Воп. 6. Спр. 45. Арк. 84.

<u>Юлік Кошка</u>

Дзякуючы свайму цвёрдаму характару, смеласці і прыроднай кемлівасці, Юлік быў прызнаны важаком сярод аднагодкаў.

У партызанскі атрад хлопчык трапіў у 1942 г., служыў там разведчыкам і быў на добрым рахунку. Ён часта хадзіў з партызанамі на чыгунку і падрываў эшалоны і масты.

Падчас адной з аперацый, мэтай якой быў захоп штабных дакументаў, юнага героя насцігла варожая куля.

Пазней пра Юліка Кошку яго былы настаўнік і камісар брыгады У.Л.Качан скажа: “Яго кароткае жыццё бліснула як вогненны метэор”.

# Падзяка камандзіра



Іван Кухто

ПАДЗЯКА КАМАНДЗІРА

Сям'я савецкіх патрыётаў Кухто з вёскі Соржыца Бешанковіцкага раёна адразу ж устанавіла сувязь з партызанамі, як толькі яны паявіліся ў навакольных лясах. Аб сувязі бацькі і маці з партызанамі ведаў іх сын Ваня, трынаццацігадовы вучань Соржыцкай школы. А ў пачатку верасня 1942 года Ваня Кухто і сам быў прыняты ў партызанскі атрад імя Лазо брыгады «За Савецкую Беларусь». На баявым рахунку юнага народнага мсціўца нямала адказных заданняў, якія ён выконваў па ўказанню камандавання. Але адзін эпізод з многіх асабліва памятны для Вані.

Было гэта ў канцы лета 1943 года. Па заданню камандавання Ваня прыбыў у вёску Баграцы да сувязной Зіны, якая павінна была перадаць яму каштоўныя звесткі.

Толькі паспела Зіна расказаць Ваню, што ў гарнізон Сожарава прыбыў атрад эсэсаўцаў (чалавек 150) з чатырма мінамётамі і гарматай, як на вуліцы ў вёсцы паявіліся на падводах добра падвыпіўшыя паліцаі. Ваня спачатку рашыў непрыкметна схавацца ад небяспекі, але было позна. І яму давялося прымаць другое, больш дзёрзкае рашэнне.

Назіраючы з хаты Зіны праз акно за паводзінамі фашысцкіх памагатых, Ваня ўбачыў, што адна павозка з паліцэйскімі спынілася ля дома старасты. Прывязаўшы каня да плота, паліцаі зайшлі ў дом. І тут Ваня заўважыў, што на гэтай павозцы стаіць кулямёт. Не доўга думаючы, ён выскачыў на вуліцу, падышоў да дома старасты і падгледзеў, што паліцэйскія працягваюць п'янстваваць.

Ваня асцярожна падкраўся да прывязанага каня, адвязаў повад, ускочыў на павозку і ва ўсю сілу пагнаў каня, каб хутчэй ад'ехаць ад дома. Тупат конскіх капытоў і грукат павозкі прыцягнулі ўвагу п'яных паліцаяў. І яны, схапіўшы вінтоўкі, выскачылі на вуліцу і адкрылі страляніну. Але і ў гэтай абстаноўцы Ваня не разгубіўся і неўзабаве дасягнуў лесу, які і схаваў яго.

Паяўленне Вані каля штабной партызанскай зямлянкі, ды яшчэ на падводзе з трафейным кулямётам, выклікала здзіўленне і захапленне ў партызан.

За гэты подзвіг і за каштоўныя звесткі, дастаўленыя камандаванню, перад строем народных мсціўцаў Ваню была аб'яўлена падзяка, а пазней ён быў узнагароджан медалем «За адвагу».

З фашысцкімі захопнікамі Ваня змагаўся ў радах народных мсціўцаў да злучэння з часцямі Чырвонай Арміі 2 ліпеня 1944 года. Ён узнагароджан таксама медалем «Партызану Айчыннай вайны» II ступені і іншымі медалямі.

З 1947 па 1951 год Іван Кухто служыў у Савецкай Арміі. Скончыўшы вучылішча механізацыі сельскай гаспадаркі, працаваў трактарыстам у родным калгасе «Звязда», а з 1957 па 1961 год — на асваенні цалінных зямель у Цалінаградскай вобласці Казахстана.

Цяпер член КПСС Іван Мікалаевіч Кухто жыве ў вёсцы Астроўна Бешанковіцкага раёна.

ДАВц. Ф. 9742-п. Воп. 6. Спр. 45. Арк. 84.

Іван Кухто

Бацькі Вані ўсталявалі сувязь з партызанамі, як толькі тыя з'явіліся ў мясцовых лясах у першыя дні вайны. Сам хлопчык быў прыняты ў партызанскі атрад імя Лазо брыгады "За Савецкую Беларусь" у пачатку верасня 1942 г.

Улетку 1943 г. у ходзе выканання чарговага задання па перадачы важнай інфармацыі ў вёсцы Баграцы, скраў фурманку з кулямётам, якая належала фашысцкім прыхвастням. За тое, што Ваня змог перадаць важную інфармацыю і трафейны кулямёт партызанскаму камандаванню, яму была выказана падзяка, а пазней – медаль "За адвагу".

Ваня змагаўся ў шэрагах народных мсціўцаў да іх злучэння з часцямі Чырвонай Арміі ў 1944 г.

Узнагароджаны медалём "Партызану Айчыннай вайны II ступені".

# З-пад носа гітлераўцаў



## З-ПАД НОСА Ў ГІТЛЕРАЎЦАЎ

Евгений Горбачевский

Жэню споўнілася толькі трынаццаць год, калі ў яго родныя месцы наляцелі фашысцкія варвары. Непадалёку ад вёскі Узніцы на Полаччыне, дзе нарадзіўся і рос Жэня, у Юравічах гітлераўцы размясцілі свой гарнізон і склад зброі. Гарачае сэрца юнага патрыёта не магло змірыцца з тым, што чужынцы гаспадараць на роднай савецкай зямлі.

У Жэні паспеў дзёрзкі, амаль неверагодны план: пранікнуць у гарнізон і нанасіць адтуль зброі. Для ажыццяўлення гэтага плана Жэня пайшоў на тое, што ўладкаваўся на нямецкай кухні падсобным рабочым. Нікому з гітлераўцаў і ў галаву не прыйшло, што хлапчук наняўся да іх на работу, каб ажыццявіць свой план.

Склад зброі быў размешчан побач з агарожай, якая прылягала да глухога завулка.

Скрытна працягнуўшы канец провада з завулка да склада, Жэня прывязаў да яго вінтоўку, а з наступленнем цемры выцягнуў яе і надзейна схаваў. Гэтым спосабам яму ўдалося выцягнуць з-пад носа ў фашыстаў яшчэ некалькі вінтовак.

Летам 1942 года да Жэні дайшлі чуткі, што ў гэтых мясцінах партызаны ўзрываюць масты і чыгуначныя рэйкі. Ён настойліва пачаў шукаць сувязь з народнымі мсціўцамі і неўзабаве трапіў да аднаго з камандзіраў брыгады «Няўлоўныя» І. В. Якімава. Нягледзячы на просьбу Жэні прыняць яго ў партызаны, яму адмовілі. Але калі Жэня расказаў аб сваёй рабоце на нямецкай кухні і пра тое, як спрытна ён ухітрыўся ўкрасці са склада вінтоўкі, І. В. Якімаў адразу ж праявіў цікавасць да Жэні.

З гэтага часу хлопчык стаў актыўным партызанскім разведчыкам. Ён не раз прыходзіў да тайніка, вымаў з яго запіскі з чарговымі заданнямі для сябе і пакідаў свае з вынікамі выканання ранейшых заданняў.

Для разгрому фашысцкага гарнізона ў Юравічах «Няўлоўным» трэба было атрымаць усе звесткі пра яго. Жэня паспяхова справіўся з гэтай задачай.

Работа на кухні дапамагла яму амаль дакладна падлічыць колькасць фашысцкіх салдат, афіцэраў у гарнізоне і высветліць, якая зброя і колькі яе захоўваецца на складзе.

Па даручэнню штаба «Няўлоўных» Жэня вельмі хітра, але з вялікай рызыкай для сябе пранёс на тэрыторыю Юравіцкага гарнізона міну замаруджанага дзеяння і паклаў яе паміж скрынямі са зброяй. Магутны выбух узрушыў паветра. Услед за ім раздалося яшчэ некалькі выбухаў: гэта рваліся боепрыпасы.

Ноччу партызаны дзёрзкім налётам разграмілі рэшткі фашысцкага гарнізона і захапілі баявыя трафеі. Жэня з гэтага часу быў залічан у рады народных мсціўцаў і яшчэ не раз праяўляў мужнасць і адвагу. Аднойчы яго ўключылі ў групу разведчыкаў, якая была паслана для ўзрыву моста цераз раку Дрысу.

Пры падыходзе да моста нашы разведчыкі трапілі ў засаду. Завязаўся няроўны бой, у якім чацвёра партызанскіх смельчакоў былі забіты. Застаўся толькі адзін цяжка ранены Жэня. Калі бой заціх, фашысты паявіліся на полі бою, разлічваючы захапіць «языка». Так яны выявілі Жэню і, прывязаўшы да яго ног вяроўку, пацягнулі паранenae цела юнага героя. Пераадольваючы нясцерпны боль і пакуты, Жэня ўсё ж не паказаў фашысцкім катам ніякіх прыкмет жыцця. І яны пакінулі яго, палічыўшы забітым. Толькі раніцай партызаны падабралі Жэню ў непрытомнасці, а партызанскія медыкі вярнулі яго да жыцця. Затым Жэня пайшоў добраахвотнікам у Чырвоную Армію і дайшоў да Берліна. За некалькі дзён да канца вайны ён зноў быў цяжка ранены.

Апошнія гады свайго жыцця Яўген Лук'янавіч жыў у вёсцы Узніцы Полацкага раёна. Інвалід Вялікай Айчыннай вайны, персанальны пенсіянер Я. Л. Гарбачэўскі памёр 3 чэрвеня 1966 года. Пахаваны на могілках вёскі Юравічы.

ДАВц. Ф. 9742-п. Воп. 6. Спр. 45. Арк. 84.

<u>Жэня Гарбачэўскі</u>

Калі недалёка ад роднай вёскі Узніцы на Полаччыне, дзе рос Жэня, размясціўся гітлераўскі гарнізон, хлопчык вырашыў уладкавацца на нямецкую кухню, каб мець магчымасць з-пад носа ворага выносіць боепрыпасы. Так немцы пазбавіліся некалькіх вінтовак.

У 1942 г. Жэня даведаўся аб дзейнасці партызан, якія падрывалі масты і чыгуначныя шлях, але хлопчыку адмовілі ў просьбе прыняць яго ў шэрагі народных мсціўцаў. Аднак, калі Жэня распавёў, што таемна змог скрасці нямецкія вінтоўкі са склада, да яго ўсё ж праявілі цікавасць.

Так хлопчык стаў актыўным партызанскім разведчыкам. Здабытая ім інфарцыя дапамагла партызанам разграміць фашысцкі гарнізон і захапіць трафеі. З гэтага часу Жэню залічылі ў шэрагі народных мсціўцаў.

Адважны юны партызан удзельнічаў у аперацыі па падрыве моста праз раку Дрыса. Аднак у ходзе няроўнага бою, з чацвярых партызан, якія трапілі ў засаду на мосце, у жывых застаўся толькі цяжкапаранены Жэня. Пасля выздараўлення смелы хлопчык пайшоў добраахвотнікам у Чырвоную Армію і дайшоў да Берліна.

# Юны кулямётчык



## ЮНЫ КУЛЯМЁТЧЫК

Даваенная біяграфія Славы Куксёнка звычайная. Нарадзіўся ў вёсцы Казлы Сенненскага (былога Багушэўскага) раёна ў 1927 годзе, вучыўся ў Канстантоўскай школе, быў піянерам, дапамагаў бацькам па гаспадарцы.

З першых жа дзён гітлераўскай акупацыі Славік уключыўся ў барацьбу з фашыстамі. Разам з братам Пятром, які быў крыху старэйшы за яго, і школьным таварышам Паўлікам Куксёнкам сталі збіраць і хаваць у лесе зброю, боепрыпасы. Асабліва актывізавалі рабяты гэту работу з лістапада 1941 года, калі вярнуўся дамоў бацька — Максім Куксёнак, які трапіў пад Вязьмай у акружэнне.

У красавіку 1942 года патрыёты звязаліся з Багушэўскім падпольным райкомам партыі і яго сакратарамі А. К. Стэльмахам і Я. М. Прахарэнкам. Зброю перадалі партызанскаму атраду Барыса Гарнака і сталі народнымі мсціўцамі. У вёсцы засталася маці з малым брацікам.

Спачатку на баявыя аперацыі Славу не бралі: ён знаходзіўся пры штабе атрада. У бой з гітлераўцамі ўступіў, калі ў жніўні 1942 года пачалася карная экспедыцыя супраць багушэўскіх партызан. У час гэтых баёў у адной з сутычак з карнікамі загінуў бацька Славіка.

Зімой 1942—1943 года сям'я панесла яшчэ адну цяжкую страту: фашысты схапілі і расстралялі ў Багушэўску брата Пятра.

Аднойчы ў час карнай экспедыцыі група партызан, у якой знаходзіўся і Слава, была адрэзана ад асноўных сіл атрада. Пасля доўгіх пакут яна далучылася да прыбыўшага на тэрыторыю Віцебскай вобласці Смаленскага палка пад камандаваннем І. Ф. Садчыкава. Гэта было ў пачатку 1943 года. У саставе палка Слава Куксёнак праваяваў да злучэння з часцямі Чырвонай Арміі ў 1944 годзе.

У адным з баёў Слава захапіў ручны кулямёт і больш з ім не разлучаўся. У многіх баях, засадах, у гарачых сутычках з фашыстамі пабываў юны партызан, але ніколі не падвёў таварышаў, дастойна працягваў справу бацькі.

...Гэта было ў вёсцы Расходнае, дзе размясціўся моцна ўмацаваны гарнізон ворага. Кулямёт Славіка біў безадмоўна па амбразуры дзота, а затым юны партызан прыкрываў адыход групы. На базу атрада вярнуўся апошнім. Хлапчук ледзь перастаўляў ногі ад стомленасці. Кулямёт забіла зямлёй, а ў стужцы засталіся ўсяго чатыры патроны.

Буйны гарнізон гітлераўцаў знаходзіўся ў вёсцы Чарэя Чашніцкага раёна. Дзве царквы і касцёл былі ператвораны ў апорныя пункты, абчэсены калючым дротам. Першая спроба партызан разграміць гарнізон поспеху не мела. Але ў гэты час партызанам дапамаглі падпольшчыкі Багушэўска. У варожых рамонтных майстэрнях яны адрамантавалі танк Т-34 і перапраўлі партызанам. З яго дапамогай быў неўзабаве разгромлен гарнізон за пяць кіламетраў ад Сянно. Прама на танку група партызан, у тым ліку і Славік з кулямётам, уварвалася ў вёску, падавіла агнявыя кропкі ворага і з падаспеўшымі асноўнымі сіламі атрада завяршыла разгром гітлераўцаў.

Поспех акрыліў партызан. Было вырашана паўтарыць паход на Чарэю, а затым на райцэнтры Чашнікі і Лепель. Адначасова полк Садчыкава блакіраваў Чашнікі. Бой працягваўся трое сутак. Райцэнтр тройчы пераходзіў з рук у рукі. Славік быў у гушчыні бою. Моцна назалялі партызанам гітлераўцы, засеўшыя з кулямётам на паддашку школы, перад якой была адкрытая плошча. Кулямётны разлік Славіка Куксёнка атрымаў заданне знішчыць акупантаў. Трое рабят з кулямётам абышлі школу са двара і падавілі гэту кулямётную кропку.

Позняй восенню 1943 года полк Садчыкава быў перакінуты ў раён Ушач, дзе вялікая група партызанскіх брыгад пад камандаваннем У. Е. Лабанка выконвала спецыяльнае заданне Цэнтральнага штаба партызанскага руху. Як ваяваў юны герой на Ушаччыне, бачна з дакументальнай кнігі У. Е. Лабанка «Партызаны прымаюць бой». Вось што ён піша: «Некалькі агнявых кропак падавілі ў баі кулямётчыкі браты Славік і Паўлік Куксёнкі. Братам было не больш 14—15 год. Юныя кулямётчыкі і раней здзіўлялі ўсіх бясстрашнасцю і воінскім майстэрствам. Браты ўмела выкарыстоўвалі вопыт баёў па разгрому гарнізона Расходнае, за Чашнікі, у якіх яны праявілі мужнасць пры знішчэнні агнявых кропак і аховы склада з боепрыпасамі».

У кнізе ўсё правільна, за выключэннем аднаго: Славік і Паўлік не былі братамі, яны аднафамільцы.

У выніку наступальных баёў Чырвонай Арміі фронт імкліва адкочваўся на захад. Многія партызанскія брыгады перабазіраваліся ў Заходнюю Беларусь. Полк Садчыкава аказаўся пад Маладзечна, дзе прыняў удзел у «рэйкавай вайне». А неўзабаве адбылася радасная сустрэча з рэгулярнымі часцямі Чырвонай Арміі. Полк быў расфарміраваны.

З сям'і Максіма Куксёнка ў жывых засталіся Славік і яго малодшы брат Аляксей.

Вячаслаў Максімавіч Куксёнак цяпер працуе наладчыкам станкоў у сталярнай майстэрні ў горадзе Ярмак. За свае баявыя подзвігі ён узнагароджан медалем «За адвагу» і юбілейнымі.

Павел Максімавіч Куксёнак жыў і працаваў у Віцебску, нядаўна памёр.

ДАВц. Ф. 9742-п. Воп. 6. Спр. 45. Арк. 86.

<u>Слава Куксёнак</u>

З першых дзён вайны піянер Слава Куксёнак уключыўся ў барацьбу з фашыстамі, збіраючы і хаваючы ў лесе разам са старэйшым братам і школьным сябрам зброю і боепрыпасы. У красавіку 1942 г., звязаўшыся з Багушэўскім падпольным райкамам партыі, яны перадалі зброю народным мсціўцам.

Упершыню супраць ворага Славік выступіў у жніўні 1942 г., калі пачалася карная аперацыя супраць багушэўскіх партызан. Тады ж загінуў бацька юнага мсціўца.

Юны партызан пабываў у многіх баях і засадах і ніколі не падводзіў таварышаў, годна працягваючы справу бацькі.

Разгром ворага каля вёскі Расходнае натхніў партызан здзейсніць паход на Чарэю, Чашнікі і Лепель. Юны кулямётчык быў актыўным удзельнікам тых падзей. А восенню 1943 г. Слава быў перакінуты ў раён Ушач, дзе таксама паказаў сябе бясстрашным і таленавітым воінам.

У складзе партызанскага палка Садчыкава прымаў удзел у “рэйкавай вайне” пад Маладзечна. За свае баявыя заслугі ўзнагароджаны медалём “За адвагу”.



# Камендант Адамаўскага лесу

Партызанскія брыгады, якія дзейнічалі на Віцебшчыне непадалёка ад лініі фронту, вясной 1943 года вымушаны былі адысці ў глыбокі тыл ворага. У час пераходу гітлераўцы акружылі некалькі атрадаў брыгады «Аляксея» ў Адамаўскім лесе. Што рабіць? Сярод партызан нямала раненых, хворых. Заставалася адно — прабірацца па балоце. Яно цягнулася на многа кіламетраў, на карце абазначана як непраходнае. Трэба было шукаць правадніка. Тутэйшыя жыхары падказалі, што вывесці партызан зможа мясцовы хлапчук, разведчык брыгады імя Заслонава. Усе яго тут называюць камендантам Адамаўскага лесу.

«Я помню, як ён прыйшоў,— пісала пазней былая партызанка В. Сіманава. — Невысокі, з бледным тварам, у цёмнай курткі, на рамяні — два пісталеты. Хлопчык трымаўся свабодна, незалежна. Ён упэўнена правёў партызан праз гразкае балота. Байцы неслі раненых. Усю ноч працягваўся небяспечны пераход, а затым народныя мсціўцы ўдарылі па карніках з тылу».

Правадніком партызан быў Валодзя Казлоўскі. Нарадзіўся ён у 1928 годзе ў вёсцы Машкі Сенненскага раёна ў сям'і лесніка. Таму і ведаў кожную мясціну, кожную сцяжынку ў лесе з дзяцінства. Гэта і дапамагло яму ў час Вялікай Айчыннай вайны стаць спачатку сувязным, а затым партызанскім разведчыкам.

Але вернемся крыху назад. Як толькі гітлераўцы прыйшлі на нашу зямлю, падлеткі па заданню старэйшага брата Валодзі Пятра пачалі збіраць зброю, боепрыпасы. Іх назбіралася нямала. Вясной 1942 года ўсё гэта перадалі партызанам.

Неўзабаве Казлоўскія ўсёй сям'ёй пайшлі ў лес. Валодзя спачатку быў разведчыкам атрада «Знішчальнік» 1-й партызанскай брыгады імя К. С. Заслонава, затым камандзірам аддзялення брыгаднай разведкі, а са студзеня 1944 года начальнікам разведкі атрада «Дзяніс».

Вось што расказвае былы камандзір атрада «Знішчальнік» Мікалай Дзмітрыевіч Навумаў: «Валодзя быў смелым разведчыкам, разумным сувязным, сапраўдным партызанам. Лес ён ведаў як ніхто з нас. Таму і называлі яго камендантам. Не адзін раз праводзіў ён нас па таемных лясных сцежках, толькі яму вядомых. А гэта было надзвычай важна, бо не раз партызаны траплялі ў крытычнае становішча.

Валодзя быў проста незаменным разведчыкам. Успамінаецца адзін выпадак. Вясной 1943 года партызаны рашылі разграміць даволі моцны варожы гарнізон у вёсцы Обаль. У разведку паслалі Казлоўскага. Праз некаторы час мы мелі падрабязныя звесткі аб гарнізоне. Аперацыя прайшла бліскуча. Гарнізон быў разгромлены, а мы не страцілі ніводнага чалавека.

Аказваецца, у Валодзі ў Обалі быў свой надзейны чалавек. Гэты «паліцэйскі» разам з Казлоўскім перад самай аперацыяй прыйшоў у атрад».

Нядаўна М. Д. Навумаў па запрашэнню піянерскай дружыны імя К. С. Заслонава сярэдняй школы № 309 г. Ленінграда ўдзельнічаў у злёце «Рэспубліка заслонаўцаў». З вялікім хваляваннем слухалі ленінградскія школьнікі пра баявыя справы народных мсціўцаў, у тым ліку і піянера Валодзі Казлоўскага, які ўнёс свой пасільны ўклад у перамогу над гітлераўскімі акупантамі.

У пасляваенны час Уладзімір Іванавіч Казлоўскі атрымаў вышэйшую адукацыю, скончыў аспірантуру, абараніў кандыдацкую дысертацыю. Цяпер ён працуе выконваючым абавязкі начальніка кафедры палітэканоміі Мінскай вышэйшай школы Міністэрства ўнутраных спраў СССР.

ДАВц. Ф. 9742-п. Воп. 6. Спр. 45. Арк. 88.

# Камендант Адамаўскага лесу

Валодзя Казлоўскі

Праз глыбокае непраходнае балота, якое цягнулася на некалькі кіламетраў, партызан і іх параненых таварышаў вывеў мясцовы хлопчык, разведчык брыгады імя Заслонава, Валодзя Казлоўскі, якога назвалі камендантам Адамаўскага лесу. Улетку 1943 г. з гэтай просьбай да яго звярнуліся атрады брыгады "Аляксея".

Вова нарадзіўся ў 1928 г. ў вёсцы Машкі Сенненскага раёна ў сям'і лесніка, таму і ведаў кожную дарожку ў лесе. Усё дзяцінства яго прайшло там.

Да таго, як хлопчык трапіў да партызанаў, ён разам са старэйшым братам збіраў зброю і боепрыпасы.

Пасля таго, як уся сям'я Вовы сышла ў лес, хлопчык стаў разведчыкам атрада «Знішчальнік» 1-й партызанскай брыгады імя К.С. Заслонава, затым камандзірам аддзялення брыгаднай разведкі, а са студзеня 1944 г. – начальнікам разведкі атрада "Дзяніс".

Дзякуючы звесткам, якія ўдалося дастаць Валодзе, была станоўча завершана аперацыя па разгрому нямецкага гарнізона ў вёсцы Обаль ў 1943 г.

# З засады - па акупантах

Пётр Разведчыкаў

## З засады—па акупантах



У пачатку 1942 года ў вёску Паташня Гарадоцкага раёна, дзе жыў Пеця Разведчыкаў (Ялтыхоў), прыбыў з-за лініі фронту невялікі атрад байцоў Чырвонай Арміі. Усе жыхары вёскі сышліся ў сялянскую хату, дзе спыніліся нашы воіны. Камандзір атрада старшы лейтэнант Мамайчук расказаў аб паражэнні гітлераўцаў пад Масквой, аб зверствах фашыстаў, аб гераічным подзвігу Зоі Касмадзям'янскай. Затаіўшы дыханне, слухаў трынаццацігадовы хлопчык расказ камандзіра.

У гэты ж час у вёсцы пачалі паяўляцца і партызаны. Пеця і яго аднагодкі выконвалі іх заданні як сувязныя. Некалькі разоў юны патрыёт ездзіў на сустрэчу з савецкімі воінамі, якія выконвалі ў тыле ворага адказныя заданні.

Аднойчы Пеця асмеліўся і папрасіў камандзіра ўзвода лейтэнанта Бяднова залічыць яго байцом Чырвонай Арміі.

— Малы ты яшчэ, хлопча,— пагладзіў яго па галаве лейтэнант.

— А я хачу біць фашыстаў, — дамагаўся свайго Пеця.

Камандзіру ўзвода спадабалася рашучасць хлопчыка і, памякчэўшы, ён сказаў:

— Добра, падумаем.

Жаданне хлопчыка збылося. З чэрвеня 1942 года ён стаў байцом-разведчыкам 136-й асобнай разведроты 47-й стралковай дывізіі. З гэтага часу і пачаліся для яго баявыя будні, поўныя рызыкі і небяспекі.

Аднойчы ноччу ўзвод паднялі па трывозе. Стала вядома, што ў вёсцы Смалоўка высадзілася вялікая група гітлераўскіх акупантаў. Пецю была пастаўлена задача прайсці ў гарнізон, падлічыць, колькі там афіцэраў, а таксама танкаў і артылерыі. Разам з правадніком хлопчык хутка адправіўся ў дарогу. За ноч пераадолелі больш дваццаці кіламетраў. У правадніка ў Смалоўцы былі блізкія родзічы. З іх дома Пеця і рашыў весці назіранне.

Днём гітлераўцы пачалі паспешліва знімацца з месца. І як толькі яны рушылі па дарозе Гарадок—Мяжа, таемна ўслед за імі адправіліся Пеця і яго праваднік. Гітлераўцы спыніліся начаваць у вёсцы Целешава. Пераканаўшыся ў гэтым, юныя разведчыкі пайшлі хутчэй дакладваць камандзіру абстаноўку.

У саставе 136-й асобнай разведвальнай роты Пеця не раз адпраўляўся разам з баявымі сябрамі ў тыл праціўніка. Дзейнічалі ў раёне паміж Невелем і Усвятамі, вялі разведку, грамілі варожыя гарнізоны.

Асабліва запомніўся Пецю бой непадалёк ад вёскі Чурылава, дзе размяшчаўся гітлераўскі гарнізон. Акупанты кантралявалі шасэ Усвяты—Невель. Штодзённа яны курсіравалі па гэтай дарозе ў вызначаны час.

Дасканала правёўшы разведку, савецкія воіны рашылі з засады ўдарыць па фашыстах з кулямётаў і аўтаматаў. Аперацыя ўдалася. Амаль усе акупанты, што рухаліся па шасэ, знайшлі тут сабе магілу.

У раёне вёскі Капусціна нашы байцы, у іх ліку і Пеця, дапамагалі перапраўляць у тыл праціўніка партызанскія абозы са зброяй і медыкаментамі.

Пасля таго, як прарыў у лініі фронту гітлераўцам удалося закрыць, савецкія разведчыкі апынуліся ў цяжкім становішчы. Не хапала боепрыпасаў, прадуктаў харчавання. Але байцы працягвалі баявыя дзеянні ў глыбокім тыле, а пасля злучыліся з нашымі часцямі.

Пазней Пеця Разведчыкаў удзельнічаў у вызваленні Невеля, Полацка, гарадоў і вёсак Прыбалтыкі ад гітлераўскіх акупантаў. У 1943 годзе ён быў узнагароджан медалем «За баявыя заслугі».

У пасляваенны час Пётр Ігнатавіч Разведчыкаў працаваў у Суражскім леспрамгасе, служыў у радах Савецкай Арміі. У цяперашні час жыве ў Віцебску, працуе на ордэна Леніна фабрыцы «КІМ».

ДАВц. Ф. 9742-п. Воп. 6. Спр. 45. Арк. 90.

Пётр Разведчыкаў

У пачатку 1942 г. у вёску Паташня Гарадоцкага раёна прыбыў невялікі атрад Чырвонай Арміі. Сабраўшы ўсіх жыхароў вёскі, байцы распавялі пра паразу гітлераўскіх войскаў пад Масквой, пра зверствы фашыстаў і адвазе падпольшчыкаў. Сярод тых, хто слухаў, быў Пеця Разведчыкаў (Ялтыхоў).
Улетку гэтага ж года хлопчык стаў байцом-разведчыкам 136-й асобнай разведроты 47-й стралковай дывізіі. Так пачаліся баявыя будні, поўныя рызыкі і небяспекі. У складзе сваёй роты разам з сябрамі Пеця не раз адпраўляўся ў тыл праціўніка, ажыццяўляючы разведку ў раёне паміж Невелем і Усвятами.
Асабліва хлопчыку запомніўся бой недалёка ад вёскі Чурылава, дзе акупанты кантралявалі шашу Усвяты – Невель. Дзякуючы нечаканаму ўдару з засады па акупантах, аперацыя скончылася шчасна – амаль усе ворагі былі ліквідаваны.
Нават калі прарыў у тыле гітлераўцам атрымалася закрыць, а савецкія разведчыкі апынуліся ў цяжкім становішчы, адважныя байцы не гублялі стойкасці духу і працягвалі баявыя дзеянні да злучэння з іншымі часткамі Чырвонай Арміі.
Пеця ўдзельнічаў у вызваленні Невеля, Полацка, гарадоў і вёсак Прыбалтыкі. У 1943 г. ён быў узнагароджаны медалём "За баявыя заслугі".



# У баях і паходах

Міша Хадыка, вучань 6 класа Чанавіцкай школы, стаў падтрымліваць сувязь з партызанамі ў канцы 1941 года. А вясной 1942 года ён перадаў партызанам, якімі камандаваў І. С. Банкароў, сем вінтовак, два аўтаматы, ручны кулямёт, каля дваццаці гранат і шмат патронаў. Зброю Міша сабраў разам са сваім сябрам Віцем Крашчанком на месцах баёў нашых воінаў з фашысцкімі захопнікамі.

Пабываўшы па заданню партызан у фашысцкім гарнізоне ў вёсцы Астроўна, Міша дэталёва вывучыў абстаноўку і аб усім убачаным расказаў камандаванню атрада. У ліпені 1942 года гарнізон быў разгромлен партызанамі. Пасля гэтага піянера залічылі ў рады народных мсціўцаў, а хутка ён прыняў і першы бой.

Вось як гэта было. На трэці дзень знаходжання ў атрадзе Мішу паслалі ў разведку ў вёску Доўгае, якая размешчана на шасэ Віцебск—Бешанковічы. Міша выявіў агнявыя кропкі ворага і сістэму яго абароны. Ацаніўшы гэтыя каштоўныя звесткі, камандаванне атрада на наступны дзень прыняло рашэнне аб разгроме ўмацаванага пункта Доўгае.

Група партызан выйшла на шасэ. І раптам на дарозе паказалася некалькі аўтамашын з гітлераўцамі. Партызаны прынялі бой. Вось падарвана першая машына. Астатнія спыніліся, і з іх сталі саскокваць у кюветы гітлераўскія салдаты. Партызаны з блізкай адлегласці закідалі іх гранатамі і амаль усіх знішчылі.

У канцы верасня 1942 года партызанскі атрад, у якім знаходзіўся Міша Хадыка, уліўся ў партызанскую брыгаду «За Савецкую Беларусь» пад камандаваннем П. М. Раманава.

У час рэйду па тэрыторыі Расонскага раёна ў пачатку 1943 года ля вёскі Шнітаўка карнікі навязалі партызанам абарончы бой. Пасля абстрэлу партызанскіх пазіцый з артылерыі гітлераўцы пайшлі ў атаку. Аднак партызаны апярэдзілі іх і масіраваным агнём сарвалі яе. На ўчастку абароны, дзе знаходзіўся Міша, няспынна страчыў варожы кулямёт, схаваны за валуном. Міша трапным агнём з карабіна падавіў агнявую кропку праціўніка.

У маі 1943 года брыгада «За Савецкую Беларусь» перадыслакавалася з баямі на тэрыторыю Ушацкага раёна. А хутка Міша Хадыка са сваім сябрам Віктарам Крашчанком накіраваўся на баявое заданне. Ноччу на дарозе Ула—Бачэйкава залажылі міну і да світання праляжалі ў кустах. Раніцай грузавая аўтамашына з гітлераўцамі падарвалася. Фашысцкае камандаванне не далічылася 15 салдат і афіцэраў.

У адным з баёў у ліпені 1943 года пры разгроме варожага гарнізона ў вёсцы Сокарава партызаны з засады напалі на групу акупантаў, якія ехалі на веласіпедах на дапамогу асаджанаму гарнізону. Частку з іх знішчылі, а астатнія разбегліся. Адзін з гітлераўцаў, фельдфебель, будучы раненым, прыкінуўся забітым. І калі міма яго прабеглі партызаны, ён з аўтамата адкрыў па іх агонь. Тады, доўга не думаючы, Міша кінуў у яго гранату. Яшчэ адным фашыстам стала менш, а Мішы дастаўся ў якасці трафея аўтамат фельдфебеля.

Пасля гэтага бою Мішу перавялі ў разведку атрада, дзе для яго пачалося новае, не менш небяспечнае баявое жыццё. Нярэдка даводзілася яму з сябрамі падкрадавацца к самаму логаву акупантаў і цэлымі днямі весці назіранне з укрыцця. А пры правядзенні баявых аперацый ён звычайна быў на чале калоны як праваднік.

Удзельнічаў Міша і ў «рэйкавай вайне», разам з партызанамі Лепельска-Ушацкай зоны быў у блакадзе. У адным з баёў быў ранен, але хутка выздаравеў і працягваў змагацца з ненавісным ворагам да злучэння з часцямі Чырвонай Арміі ў чэрвені 1944 года.

Пасля вайны Міша закончыў будаўнічае вучылішча, служыў у Савецкай Арміі, закончыў тэхнікум лёгкай прамысловасці, вячэрні універсітэт марксізму-ленінізму. Цяпер камуніст Міхаіл Яфімавіч Хадыка, ураджэнец вёскі Гароднія Бешанковіцкага раёна, жыве ў Віцебску, працуе кіраўніком дамоў.

За ратныя подзвігі ўзнагароджан медалем «За адвагу» і іншымі медалямі.

ДАВц. Ф. 9742-п. Воп. 6. Спр. 45. Арк. 92.

# У баях і паходах

<u>Міхаіл Хадыка</u>

Міша, вучань 6 класа Чанавіцкай школы, стаў падтрымліваць сувязь з партызанамі ў канцы 1941 г. Разам з сябрамі ён збіраў варожую зброю і перадаваў яе народным мсціўцам, а таксама даследаваў абстаноўку на тэрыторыі, якую займаў вораг, і інфармаваў камандаванне атрада.

Далучыўшыся да партызанаў, вельмі хутка прыняў свой першы бой на шашы Віцебск – Бешанковічы каля вёскі Доўгае.

У канцы верасня 1942 г. атрад Мішы злучыўся з партызанскай брыгадай “За Савецкую Беларусь” пад камандаваннем П.М. Раманава і ўдзельнічаў ў рэйдзе па тэрыторыі Расонскага раёна.

У 1943 г. Міша паспяхова здзейсніў падрыў на дарозе Ула – Бачэйкава, у выніку якога вораг страціў 15 салдат і афіцэраў.

Пазней хлопчык быў пераведзены ў разведку атрада, дзе пачалося яго новае небяспечнае баявое жыццё: вылазкі ў логава акупантаў, удзел у “рэйкавай вайне” з партызанамі Лепельска-Ушацкай зоны і інш.

За ваенныя подзвігі ўзнагароджаны медалём “За адвагу” і інш.

# Экзамен на мужнасць



Арляняты

Экзамен на мужнасць

Жора Юзаў здагадваўся, што яго старэйшыя сябры Павел Вішнеўскі, Ягор Сімакоў, Саша Урублеўскі падтрымліваюць сувязь з партызанамі. Яны то паяўляліся ў акупіраваным Віцебску, то знікалі на некаторы час. Аднойчы Жора бачыў, як яны хавалі зброю. Усё зразумела: хаваюць, каб перадаць партызанам.

У ліпені 1943 года Жора папрасіў Сашу Урублеўскага, каб ён завёў яго да партызан. Саша згадзіўся. Хлопчык узяў з сабой чатыры гранаты, у бакавую кішэню пінжака паклаў пісталет і адправіўся ў дарогу. Каб не выклікаць падазрэння ў гітлераўцаў, узяў з дому касу і граблі. Бацькі пра задуму хлопчыка нічога не ведалі.

У другой палавіне дня на ўскраіне лесу сустрэлі партызан. Камандзір атрада Сакалоў пахлопаў хлопчыка па плячы і жартам спытаў:

— А гэтага малога хто будзе няньчыць?

Жора жарту не зразумеў, дастаў гранаты і пісталет і сказаў:

— Яны будуць няньчыць мяне.

Партызаны засмяяліся, а камандзір, гледзячы на хлопчыка, дадаў:

— Добры будзе партызан, хоць і малы.

Так Жора Юзаў стаў партызанам шостага атрада брыгады «За Савецкую Беларусь».

Неўзабаве давялося прыняць удзел у баявой аперацыі. Гітлераўскія акупанты рашылі прачасаць Чанаўскі лес, каб выжыць адтуль партызан. Яны тайком пачалі перапраўляцца цераз Дзвіну. Агнём сустрэлі народныя мсціўцы няпрошаных гасцей. У гэтым баі юны партызан прайшоў першае баявое хрышчэнне.

Атрад № 6 быў дыверсійны, і Жора Юзаў не раз хадзіў з сябрамі-падрыўнікамі на чыгунку. Таемнымі ляснымі сцежкамі прабіраліся народныя мсціўцы да мастоў, якія мелі важнае стратэгічнае значэнне, ставілі міны на шасэ Віцебск—Лепель. І радасна было на сэрцы, калі ўзляталі ў паветра варожыя машыны, гітлераўскія матацыклісты, спыняўся рух паяздоў па чыгунцы.

Дыверсійны атрад, у якім здаваў экзамен на мужнасць юны патрыёт, удзельнічаў у шырока вядомай аперацыі «Прарыў» ва Ушацкім раёне. Каб вырвацца з варожага кальца, даводзілася ісці ў рукапашны бой з азвярэлымі фашыстамі. Побач гінулі баявыя сябры, з якімі разам хадзіў на адказныя заданні, з якімі здружыўся. Сэрца гарэла нянавісцю да чужынцаў, хацелася хутчэй ачысціць ад іх родную зямлю, і таму ў бой ішоў без страху, не зважаючы на небяспеку.

Пасля «Прарыву» была блакада каля возера Палік. Хто прайшоў яе, ніколі не забудзе тых векапомных дзён... І, нарэшце, светлы дзень вызвалення. Пад чырвоным сцягам народныя мсціўцы праехалі на конях па цэнтральнай вуліцы Бешанковіч.

У пасляваенны час Георгій Мінавіч Юзаў служыў у радах Савецкай Арміі. Пасля дэмабілізацыі працаваў на прыстані «Віцебск», аўтарамонтным заводзе. Цяпер працуе токарам ва ўпраўленні водаканалізацыйнай гаспадаркі.

ДАВц. Ф. 9742-п. Воп. 6. Спр. 45. Арк. 95.

Георгій Юзаў

Даведаўшыся, што сябры падтрымліваюць сувязь з партызанамі і перадаюць ім зброю, летам 1943 г. Жора Юзаў папрасіў, каб яго таксама прывялі да народных мсціўцаў, дзе хлопчыка прынялі ў шосты атрад брыгады “За Савецкую Беларусь”.
Першы бой юны партызан прыняў каля Чанаўскага лесу.
Не раз Жора хадзіў з сябрамі-падрыўнікамі з шостага дыверсійнага атрада на чыгунку і да мастоў, якія маюць важнае стратэгічнае значэнне, ставіў міны на шашы Віцебск – Лепель.
Атрад Жоры ўдзельнічаў у вядомай аперацыі “Прарыў” ва Ушацкім раёне. Пасля “Прарыву” была блакада каля возера Палік.
Нарэшце, надышоў той дзень, калі пад чырвоным сцягам народныя мсціўцы праехалі на конях па цэнтральнай вуліцы Бешанковічаў.

# Па даручэнню партызанскіх камандзіраў



## Па даручэнню партызанскіх камандзіраў

Восенню 1941 года вялікую работу па стварэнню падпольных груп у Сенненскім раёне праводзіў Людвіг Іванавіч Сяліцкі, які пазней стаў камандзірам 1-й партызанскай брыгады імя Героя Савецкага Саюза К. С. Заслонава.

У вёсцы Маргойцы ён устанавіў сувязь з былым шафёрам Сенненскага льнозавода Р. А. Пракаповічам, які з дапамогай надзейных людзей хаваў зброю і боепрыпасы, займаўся зборам разведвальных даных аб праціўніку. Дапамагалі ў гэтым бацьку дзанаццацігадовы сын Міця і яго сябры.

Па заданню Р. А. Пракаповіча хлапчукі знаходзілі зброю ў самых нечаканых месцах: на палянах, ля абочын дарог, у ямах ля вывернутых дрэў. Аднойчы ім удалося натрапіць на цэлы склад гаўбічных снарадаў. Яны яго надзейна замаскіравалі, прыкмецілі месца.

Бацька Міці падтрымліваў сувязь з падпольшчыкамі Беліцы, заслонаўцамі, разам з баявымі таварышамі ўдзельнічаў у аперацыях па знішчэнню гітлераўскіх прыслужнікаў. Акупантам удалося натрапіць на след падпольшчыкаў. Па даносу здрадніка некаторыя з іх былі арыштаваны і затым расстраляны. Загінуў у 1942 годзе і бацька Міці.

Пасля гэтага хлопчыку з маці даводзілася жыць у чужых людзей аж да таго часу, пакуль тутэйшая мясцовасць не стала партызанскай зонай.

У якасці разведчыка Міця ўдзельнічаў у падрыхтоўцы разгрому гітлераўскага гарнізона ў вёсцы Беліца. Цэлы тыдзень ён штодзённа хадзіў туды, запамінаў, як размешчаны абарончыя збудаванні. Усе гэтыя звесткі перадаваў партызанам. І хоць адразу захапіць гарнізон народным мсціўцам не ўдалося, гітлераўцы былі ў паніцы. Не чакаючы паўторнай аперацыі партызан, яны перабраліся ў Сянно.

У час «рэйкавай вайны» вельмі спатрэбіліся тыя склады са снарадамі, якія знаходзілі Міця і яго сябры летам і восенню 1941 года. Партызаны пачалі выплаўляць з іх тол прама ў лесе. Яны шчыра дзякавалі юным патрыётам за іх дапамогу ў барацьбе з гітлераўскімі акупантамі.

Міця акуратна выконваў многія іншыя даручэнні партызан. Аб гэтым красамоўна сведчыць баявая характарыстыка, якую даў яму партызанскі камбрыг Л. І. Сяліцкі. У ёй ёсць такія радкі: «...з'яўляўся сувязным падпольнай групы Л. І. Сяліцкага, арганізоўваў збор ручных гранат, якія перадаў пазней партызанскаму атраду А. Д. Клячына. З развіццём партызанскага руху на Сенненшчыне выконваў даручэнні камандзіраў брыгад 1-й імя К. С. Заслонава і Сенненскай па разведцы праціўніка ў гарнізонах Беліца і Сянно... Праяўляў вынаходлівасць і смеласць, неаднаразова падвяргаўся небяспецы, але ўмела выходзіў з цяжкага становішча».

У час блакады Міця страціў сувязь з партызанамі. Але яму давялося разам з дарослымі ратаваць мірных жыхароў (пераважна дзяцей і старых) ад голаду, ахоўваць ад карнікаў. Цывільнае насельніцтва жыло ў зямлянках, надзейна замаскіраваных у лясным гушчары. Глухіміляснымі сцежкамі не раз Міця прабіраўся ў вёску, каб узяць там харчоў для хворых і дзяцей. Гэта былі вельмі небяспечныя паходы.

Аднойчы да лагера падышло некалькі гітлераўцаў. Ужо чуваць было, як яны аб чымсьці перагаворваюцца паміж сабою. Рабяты, у тым ліку і Міця, пачалі страляць па іх з вінтовак. Акупанты падумалі, што натыкнуліся на партызан, і разбегліся. Кінулі нават кухню і рэчавыя мяшкі.

У пасляваенны час Дзмітрый Рыгоравіч Пракаповіч служыў у Савецкай Арміі, атрымаў вышэйшую адукацыю, стаў камуністам. Працаваў у Наваполацку на хімкамбінаце, у гарадской газеце «Химик». Цяпер жыве ў Віцебску, працуе кіраўніком аддзела ў адным з праектных інстытутаў.

ДАВц. Ф. 9742-п. Воп. 6. Спр. 45. Арк. 95.

Дзмітрый Пракаповіч

Міца Пракаповіч дапамагаў свайму бацьку хаваць зброю і боепрыпасы, а таксама займаўся зборам разведдадзеных для аднаго з арганізатараў падполля ў Сенненскім раёне Людвіга Іванавіча Сяліцкага.

Па даносе здрадніка некаторыя члены падполля былі схоплены і пакараны. Сярод іх апынуўся і бацька Міці.

У якасці разведчыка і сувязнога падпольнай групы Л.І. Сяліцкага хлопчык удзельнічаў у падрыхтоўцы разгрому гітлераўскага гарнізона ў вёсцы Беліца, здабываў каштоўную інфармацыю ў тыле фашыстаў. Пасля няўдалай аперацыі, якая ўсё ж змагла напалохаць ворага, партызаны перабраліся ў Сянно.

Падчас "рэйкавай вайны" і спатрэбіліся тыя боепрыпасы, што ў свой час схавалі Міця і яго сябры.

З развіццём партызанскага руху на Сенненшчыне хлопец выконваў даручэнні камандзіраў брыгад імя К.С. Заслонава і Сенненскай па разведцы праціўніка ў гарнізонах Беліца і Сянно, здзяйсняў небяспечныя паходы для выратавання ад голаду дзяцей і старых, якія хаваліся ад нямецка-фашысцкіх карнікаў ў лясных зямлянках.

# Медыкаменты для савецкіх байцоў

Борис мироненко

## Медыкаменты для савецкіх байцоў

Бора Міраненка да вайны скончыў пяць класаў школы № 11 г. Віцебска. Вялікая Айчынная застала яго ў піянерскім лагеры на беразе возера Лосвіда. Заставацца ў піянерскім лагеры далей стала немагчыма: не да дзіцячых забаў было рабятам, калі палаюць нашы гарады і сёлы.

Бора разам з іншымі рабятамі пешшу дабраўся да Віцебска, дзе жылі маці і сястра. К гэтаму часу маці працавала на будаўніцтве абарончых умацаванняў горада, а сястра-камсамолка Вера к пачатку вайны скончыла медвучылішча.



Незадоўга да акупацыі Віцебска гітлераўцамі сям'я Міраненкі пайшла з горада і дабралася да вёскі Паддуб'е былога Суражскага раёна. Але неўзабаве вярнуліся ў Віцебск. Горад к гэтаму часу ўжо быў разбураны, многія будынкі згарэлі. Тут жа Барыс і Вера ўбачылі адну з першых ахвяр гітлераўскага «новага парадку» — павешаную на слупе савецкую патрыётку. Гэта злачынства акупантаў зрабіла ашаламляльнае ўздзеянне на юнага патрыёта, і ён даў клятву ў меру сваіх сіл змагацца з каварным ворагам, які ўварваўся на нашу зямлю.

Па просьбе сястры Бора дапамог ёй перанесці дамоў з разбуранага будынка аптэкі на плошчы Свабоды нямала розных лякарстваў. Зрабіўшы такім чынам запас медыкаментаў, бінтоў, медыцынскіх інструментаў, Бора і Вера перанеслі іх з горада ў вёску Паддуб'е. К гэтаму часу ў лесе каля вёскі хавалася некалькі раненых нашых байцоў і камандзіраў, якім патрэбна была дапамога. Яны разам з сяброўкай Веры камсамолкай Еўдакіяй Нікіфарэнка дапамаглі савецкім воінам хутка залячыць раны і вярнуцца ў строй.

Неяк у студзені 1942 года Бора знайшоў каля лесу на снезе звязку савецкіх лістовак, відаць, скінутых з самалёта. У лістоўках паведамляліся падрабязнасці разгрому гітлераўцаў пад Масквой. Гэтыя лістоўкі па парадзе сястры і Еўдакіі Нікіфарэнка Бора разнёс у бліжэйшыя населеныя пункты і нават у Віцебск і распаўсюдзіў іх сярод савецкіх людзей.

Вясной 1942 года Бора Міраненка перадаў партызанам брыгады Аляксея зброю і боепрыпасы, якія яму ўдалося сабраць і надзейна схаваць.

Да ўходу ў партызанскі атрад № 5 брыгады Аляксея летам 1942 года сястра Боры Вера выконвала адказныя заданні падпольнага Лёзненскага райкома партыі і партызанскага камандавання. Яна бывала ў Віцебску, хадзіла праз «Суражскія вароты» за лінію фронту.

У баявых і небяспечных справах сястры актыўна ўдзельнічаў і Бора. Ён неаднаразова насіў у Віцебск і прадаваў ягады, а на выручаныя грошы купляў соль і затым прыносіў у Паддуб'е і перадаваў яе народным мсціўцам. Ні цяжкасці далёкіх пераходаў, ні сустрэчы з гітлераўцамі, якія правяралі кожнага, хто прыходзіў у горад, не маглі запалохаць піянера. Ён унёс свой пасільны ўклад у агульнанародную справу выгнання захопнікаў з савецкай зямлі.

Цяпер Барыс Радзівонавіч Міраненка жыве ў Віцебску, працуе ў вытворчым аб'яднанні «Маналіт». Яго поспехі ў працы адзначаны многімі граматамі і падзякамі.

ДАВц. Ф. 9742-п. Воп. 6. Спр. 45. Арк. 95.

Барыс і Вера Міраненкі

Бора паспеў скончыць толькі пяць класаў школы № 11 г. Віцебска, як вайна заспела яго ў піянерскім лагеры.

Да акупацыі горада яго сям'я перасялілася ў вёску Паддуб'е былога Суражскага раёна, аднак неўзабаве вымушана была вярнуцца ў разбураны горад.

Разам са старэйшай сястрой Верай, якая да пачатку вайны паспела скончыць медыцынскае вучылішча, Бора пачаў збіраць лекі, бінты і медыцынскія інструменты з разбураных будынкаў аптэк і пераваэіць іх ў Паддуб'е. Недалёка ад вёскі хавалася некалькі параненых савецкіх байцоў, якім патрабавалася медыцынская дапамога.

Увесну 1942 г. Бора перадаў партызанам брыгады “Аляксея” ўзбраенне і боепрыпасы, якія ўдалося знайсці.

Неаднаразова дапамагаў сваёй сястры ўдзельнічаць у баявых і небяспечных справах: выконвалі даручэнні ў Віцебску, выходзілі за лінію фронту, прадавалі ягады, а на атрыманыя грошы куплялі соль і перадавалі яе народным мсціўцам у Паддуб'е.

Ні цяжар вялікіх пераходаў, ні сустрэчы з гітлераўцамі не перашкодзілі брату і сястры ўнесці свой уклад у вызваленне роднай зямлі ад захопнікаў.

# З сям'і камуністаў




Братья Яцко

## З СЯМ'І КАМУНІСТАЎ

Іван Гаўрылавіч Яцко перад вайной працаваў дырэктарам Якаўлевіцкай школы ў Аршанскім раёне, а яго жонка была загадчыцай навучальнай часткі. У сям'і расло трое сыноў і дачка. Бацькі былі камуністамі, а дзеці — Карл, Валодзя, Гера і Ларыса — піянерамі. Яны любілі вясёлыя гульні, піянерскія кастры, былі ў захапленні ад сустрэч з беларускімі пісьменнікамі, зачытваліся кнігамі А. Гайдара і М. Астроўскага.

І вось вайна. Бацька і маці адразу ж вызначылі свае месца ў барацьбе з акупантамі і не ўтойвалі гэта ад дзяцей. Усёй сям'ёй яны хавалі раненых чырвонаармейцаў, збіралі зброю і боепрыпасы.

Пры паяўленні партызан старэйшыя Валодзя і Карл пачалі выконваць ролю сувязных. Яны дастаўлялі народным мсціўцам зброю, каштоўныя звесткі, пераносілі размножаныя на школьнай машынцы лістоўкі.

Так працягвалася да сакавіка 1943 года, калі на сям'ю Яцко абрушылася бяда. Па даносу здрадніка былі арыштаваны бацька Іван Гаўрылавіч і маці Матрона Емяльянаўна. На працягу двух месяцаў каты мучылі іх, дабіваючыся звестак аб партызанах, аднак патрыёты маўчалі.

Пасля пакарання бацькоў у маі 1943 года гітлераўцы рашылі ўзяцца і за дзяцей, якія засталіся на выхаванні 83-гадовай бабулькі. Але падпольшчыкі былі напагатове і своечасова паспелі пераправіць дзяцей у партызанскі атрад А. З. Васільева 35-й партызанскай брыгады.

Спачатку Карл і Уладзімір даглядалі раненых, дапамагалі весці партызанскую гаспадарку, неслі вартавую службу.

Аднак такое становішча ў атрадзе іх не зусім задавальняла: яны хацелі помсціць за бацькоў, страту якіх цяжка перажывалі і якімі ганарыліся. Неўзабаве разведка і сувязь з падполлем сталі асноўным заняткам рабят у партызанскім атрадзе.

Пад выглядам бяздомных хлопчыкаў Валодзя і Карл хадзілі разведваць гарнізоны ў Оршы, Горках, Якаўлевічах, Светачоўцы.

Вось адзін з эпізодаў.



Карл ЯЦКО



Валодзя ЯЦКО

Калі партызаны задумалі разграміць варожы гарнізон у вёсцы Светачоўка, у разведку паслалі Валодзю і Карла, якія добра ведалі мясцовасць. Два дні рабяты назіралі за гарнізонам. Яны высветлілі, калі адбываецца змена вартавых, найбольш зручныя падыходы да пастоў, заўважылі нават, дзе ў казарме стаіць піраміда са зброяй.

Ноччу хлапчукі прывялі да вёскі партызанскі атрад. Бой быў нядоўгім. Партызаны захапілі абоз з боепрыпасамі, харчаваннем, у іх рукі трапілі некаторыя здраднікі, якіх затым судзіў партызанскі суд.

У верасні 1943 года па шляху ў Оршу Карл быў апазнаны начальнікам Якаўлевіцкай паліцыі і схоплены. На ўсе пытанні пры допытах гаварыў адно: «Не ведаю». Паўжывога хлопчыка кінулі ў біткам набітую людзьмі камеру смертнікаў. Адсюль штодзённа на досвітку выводзілі людзей на пакаранне.

Калі дайшла чарга да Карла, ад пабояў і голаду ён не мог хадзіць. Яго вынеслі на вуліцу таварышы па камеры. Усе разумелі, што жыць ім засталося нямнога. Але тут здарылася нечаканае. Наляцелі савецкія самалёты і пачалі бамбіць варожыя войскі на шасэ Орша—Магілёў. Сярод акупантаў пачалася паніка. І ў гэты час хтосьці схапіў Карла на рукі і крыкнуў: «Уцякаем, табе яшчэ жыць трэба!».

Апрытомнеў Карл у лесе ад холаду. Нейкі стары падабраў яго і прывёз да сябе дамоў. Крыху набраўшыся сіл, Карл зноў пайшоў у атрад, дзе ўдзельнічаў у баявых аперацыях, падрыве варожых эшалонаў, у баях з карнікамі аж да вызвалення Віцебшчыны ў чэрвені 1944 года.

Пасля вайны Карл вучыўся ў рамесным вучылішчы, працаваў, скончыў вячэрнюю школу, паступіў у Ленінградскі караблебудаўнічы інстытут на завочнае аддзяленне. У 1958 годзе стаў камуністам.

Цяпер Карл Іванавіч працуе на Уральскім машынабудаўнічым заводзе ў зборачным цэху. Ён узнагароджан медалем «За перамогу над Германіяй», юбілейнымі медалямі, многімі граматамі. Ён ударнік камуністычнай працы, занесены ў Кнігу гонару і на Дошку гонару завода.

Уладзімір Іванавіч цяпер працуе шафёрам таксі ў Карагандзінскай вобласці.

Засталіся жывымі Герман і Ларыса. Савецкая ўлада дапамагла ім стаць на ногі, атрымаць адукацыю.

Нягледзячы на тое, што Карл і Уладзімір Яцко жывуць і працуюць далёка ад родных мясцін, яны падтрымліваюць сувязь з беларускімі піянерамі, ім пішуць з розных гарадоў і школ рэспублікі. У 1966 годзе іх адшукаў былы камандзір партызанскага атрада А. З. Васільеў.

ДАВц. Ф. 9742-п. Воп. 6. Спр. 45. Арк. 96.

<u>Карл і Валодзя Яцко</u>

Піянеры Карл, Валодзя, Гера і Ларыса выраслі ў сям'і камуністаў – дырэктара Якаўлевіцкай школы Аршанскага раёна Івана Яцко і яго жонкі Матроны Емяльянаўны, якая была загадчыцай навучальный часткі.

Калі пачалася вайна, сям'я хавала параненых чырвонаармейцаў, збірала ўзбраенне і боепрыпасы. Старэйшыя, Карл і Валодзя, выконвалі таксама ролю сувязных.

У сакавіку 1943 г. бацькоў юных патрыётаў схапілі і пасля доўгіх катаванняў забілі.

Падпольшчыкі паспелі пераправіць дзяцей у адзін з партызанскіх атрадаў. Спярша хлопчыкі дапамагалі даглядаць параненых, а потым заняліся разведкай.

Пад выглядам жабракоў Карл і Валоля разведвалі гарнізоны ў Оршы, Горках, Якаўлевічах, Светачоўцы, назіралі за зменай варты і адзначалі месца абозу з прадуктамі харчавання і зброяй.

У верасні 1943 г. Карл быў схоплены паліцыяй і ледзь не растраляны, але цудам застаўся жывы і змог вярнуцца ў атрад. Прымаў удзел у ваенных аперацыях аж да вызвалення Віцебшчыны ў чэрвені 1944 г.



# ВОГНЕННЫМІ ДАРОГАМІ ВАЙНЫ

Нарадзіўся Лёня Бароўскі ў 1929 годзе ў вёсцы Кабішча Гарадоцкага раёна. Да вайны скончыў пяць класаў. На гэтым вучобу давялося прыпыніць надоўга.

У 1942 годзе партызаны разгарнулі актыўную барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Хацеў стаць народным мсціўцам і Лёня, але ў атрад яго не ўзялі: малы зусім, пачэпіць вінтоўку на плячо — па зямлі матляцца будзе.

Тым не менш камандзір 7-га атрада брыгады імя Ленінскага камсамола І. М. Дзянісаў звярнуў увагу на настойлівага хлопчыка, якому вельмі хацелася ваяваць з гітлераўскімі акупантамі.

— Справа для цябе знойдзецца, — сказаў ён хлопчыку. — І не менш важная, чым удзел у баях з гітлераўцамі. Будзеш сувязным-разведчыкам.

Такая прапанова Лёню зацікавіла. Пра разведчыкаў ён нямала прачытаў кніг яшчэ да вайны. Мужныя, гераічныя людзі. А цяпер прыйшоў час самому паспрабаваць сілы.

Камандзір атрада даваў юнаму патрыёту заданні весці разведку аб праціўніку ў раёне Гарадка, вёсках Пальмінка, Раманава і іншых. Лёня павінен быў вызначаць колькасць жывой сілы і тэхнікі ворага, агнявыя кропкі, абарончыя збудаванні, месцы дыслакацыі штабоў і г. д.

У гэты час гітлераўцы пачалі інтэнсіўна перакідваць жывую сілу і баявую тэхніку па чыгунцы і шасэ Віцебск—Гарадок—Езярышча. Перад Лёнем ставілася задача запамінаць індэксы на бартах машын, лічыць, колькі іх прайшло за той ці іншы дзень па шасэ, якія саставы і ў якім напрамку рухаліся па чыгунцы. Усе гэтыя звесткі ён акуратна перадаваў камандзіру атрада.

Аднойчы ў Гарадку хлопчыка затрымалі гітлераўцы. Ён заплакаў. імгненна рвануўся да незнаёмай жанчыны, якая была непадалёк, і закрычаў «Мама! Мама!». Жанчына схапіла Лёню за руку і пачала тлумачыць акупантам, што гэта яе сын-свавольнік, якога ніяк не ўтрымаць каля сябе. Вынаходлівасць дапамагла пазбегнуць немінучай расправы.

Камандзір атрада І. М. Дзянісаў даў Лёню Бароўскаму такую характарыстыку: «Ён быў смелым, вынаходлівым хлапчуком. На яго, маленькага ростам, амаль не звярталі ўвагі гітлераўцы».

Савецкія воіны тым часам цяснілі акупантаў усё далей і далей. Аднойчы хлопчык убачыў недалёка ад сябе людзей у маскхалатах. Схаваўшыся за дрэва, пачаў назіраць. Дзіва ды й годзе: гавораць па-руску, смяюцца, жартуюць. І раптам кінуліся ў вочы чырвоныя зорачкі на шапках. «Нашы!» — закрычаў ад радасці Лёня і пабег да салдат.

Гэта былі байцы 235-й стралковай Чырванасцяжнай (пазней Віцебскай) дывізіі. Яго абагрэлі, накармілі, падлячылі, і ў студзені 1944 года Лёня стаў выхаванцам воінскай часці. Яму нават дазволілі на некалькі дзён адлучыцца дадому, каб пабачыцца з маці, братам і сёстрамі, бо гэта мясцовасць ужо была ачышчана ад акупантаў.

Лёню залічылі ў каменданцкі ўзвод. Вясною Лёню выклікаў начальнік палітаддзела дывізіі палкоўнік Русаў і прапанаваў яму стаць яго ад'ютантам. І як ні хацелася быць разведчыкам (тым больш, што справа гэта добра знаёмая), не згадзіцца з такой ганаровай прапановай ён не мог.

Амаль увесь час палкоўнік Русаў праводзіў у палках, батальёнах, ротах, на рубяжах, дзе стваралася сістэма абароны. І ўсюды за ім, нібы цень, хадзіў яго ад'ютант. Здаралася, разам з байцамі адбівалі контратакі праціўніка. Побач з палкоўнікам у такі час заўсёды быў і Лёня Бароўскі.

Часць, у якой служыў юны патрыёт, удзельнічала ў вызваленні Віцебшчыны, фарсіравала Дзвіну. Затым шлях яе ляжаў да берагоў Балтыкі. Вогненнымі дарогамі прайшоў разам з баявымі сябрамі ад Гарадка да Данцыга і Лёня Бароўскі.

За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў баях з гітлераўскімі захопнікамі, юны воін узнагароджан ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За ўзяцце Кенігсберга», «За перамогу над Германіяй».

Цяпер камуніст Леанід Васільевіч Бароўскі жыве ў Маскве, служыць у органах унутраных спраў. Пасля вайны ўзнагароджан сямю медалямі.

ДАВц. Ф. 9742-п. Воп. 6. Спр. 45. Арк. 96.

# Вогненнымі дарогамі вайны

Леанід Бароўскі

Да вайны Лёня скончыў пяць класаў школы у вёсцы Кабішча Гарадоцкага раёна. З прыходам партызан народным мсціўцам хацеў стаць і Леанід, аднак у атрад яго не ўзялі, бо быў зусім маленькім. Затое партызаны даверылі хлопчыку не менш важную справу – быць сувязным-разведчыкам. Юны патрыёт вёў разведку ў раёне Гарадка, вёсках Пальмінка, Раманава і інш., вызначаў колькасць жывой сілы праціўніка і тэхнікі, агнявыя кропкі, абарончыя будынкі, месцы дыслакацыі штабоў, запамінаў колькасць машын, якія праехалі па шашы Віцебск – Гарадок – Езярышча.

У 1944 г. Леанід трапіў выхаванцам у 235-ю стралковую Чырванасцяжную (потым – Віцебскую) дывізію. Пазней хлопчыка залічылі ў каменданцкі ўзвод, а вясной 1944 г. ён стаў ад'ютантам начальніка палітаддзела дывізіі палкоўніка Русава, разам з якім на рубяжах давялося адбіваць контратакі праціўніка.

Юны патрыёт удзельнічаў у вызваленні Віцебска, фарсіраванні Заходняй Дзвіны, у баях на берагах Балтыкі. Баявымі дарогамі прайшоў ад Гарадка да Данцыга.

За мужнасць і адвагу ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі "За ўзяцце Кёнігсберга", "За перамогу над Германіяй".

# За “языком”

## З А «Я З Ы К О М»

Да Вялікай Айчыннай вайны Коля Варахобка паспеў закончыць шэсць класаў Лабачэўскай школы Бешанковіцкага раёна.

Гарачым ліпеньскім днём вайна дакацілася і да Лабачэва. Ішлі цяжкія баі. Калі яны заціхлі, непадалёку ад вёскі хлапчукі ўбачылі некалькі пакінутых самалётаў. Яны, відаць, былі няспраўныя. Коля прабраўся сюды і агледзеў кабіны самалётаў. Праявіўшы ўменне абыходзіцца з тэхнікай (бацька Колі да вайны быў механізатарам, і ў яго хлопчык многаму навучыўся), зняў з самалёта кулямёт з патронамі і некалькі алюмініевых прапелераў. Кулямёт і патроны надзейна схаваў, а прапелеры пачаў пераплаўляць на сталовыя лыжкі, якія абменьваў потым на прадукты харчавання. Гэты занятак пазней яму вельмі спатрэбіўся.



Коля не мог мірыцца з устаноўленым гітлераўскімі захопнікамі «новым парадкам». Яго, зусім яшчэ падлетка, стараста вёскі прымушаў штодзённа займацца непасільнай працай на немцаў, а за адмаўленне ад работы жорстка збіваў.

Неўзабаве сярод жыхароў вёскі ўсё часцей пачалі весціся размовы аб тым, што ў навакольных лясах дзейнічаюць супраць акупантаў партызаны. Але дзе яны знаходзяцца, як іх знайсці? І Коля рашыў у што б там ні было адшукаць партызан і ўліцца ў іх рады. Вось тут і спатрэбіліся яму алюмініевыя лыжкі! Пад выглядам іх абмену ён у маі 1942 года два тыдні блукаў па вёсках і, нарэшце, апынуўся ў размяшчэнні партызанскага атрада «Марак», якім камандаваў Дзмітрый Коркін.

Уступіў Коля ў партызанскі атрад са сваёй зброяй, знятай з самалёта. Камандаванне накіравала яго ў разведку. Так пачалося баявое партызанскае жыццё хлапчука, поўнае небяспекі, якое пад сілу толькі храбрым людзям.

Паяўляцца ў адной і той жа вопратцы ў размяшчэнні гітлераўскіх гарнізонаў, якія знаходзіліся ў розных вёсках, было небяспечна — адразу ж будзеш заўважаны акупантамі. Разумеў гэта і Коля. І таму кожны раз, калі ішоў на чарговае заданне, прыходзілася мяняць вопратку.

«Адзін баявы эпізод з жыцця партызанскага разведчыка, — піша ў сваіх успамінах Мікалай Варахобка, — мне асабліва запомніўся. Партызанскае камандаванне загадала ў што б там ні было захапіць «языка». Выкананне гэтага задання было даручана дваім бывалым партызанам і мне. Мы дабраліся да шасейнай дарогі на Сянно ў раёне вёскі Горныя Ходцы і пачалі назіраць. На праезнай частцы дарогі ўстанавілі невялікую міну нацяжнога дзеяння і старанна замаскіравалі яе.

Праз некаторы час мы пачулі шум матора і затым убачылі нямецкую грузавую аўтамашыну. Тузанулі за шнур, і раздаўся выбух. Машына, рыпнуўшы тармазамі, спынілася. Гітлераўцы ад нечаканасці разгубіліся. Мы ў момант падбеглі да машыны, страляючы на хаду, з крыкамі «рукі ўверх!». Як выявілася, у кабіне знаходзіліся два афіцэры, у кузаве — два салдаты. Яны памкнуліся абстраляць нас. Але мы не разгубіліся, далі ім «агеньчыку», і яны вываліліся з кабіны з паднятымі рукамі. Так усіх чатырох і захапілі ў палон. Афіцэры, відаць, былі каштоўнымі «языкамі», бо іх, як нам пасля сказалі, накіравалі самалётам за лінію фронту на Вялікую зямлю.

Хаваючыся ад праследавання, маці Колі, яго малодшая сястра і два браты пайшлі ў лес пад ахову партызан і дапамагалі ім, чым маглі. Старэйшая, 16-гадовая сястра Ніна была партызанкай.

За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў баях з гітлераўскімі захопнікамі, Коля ўзнагароджан медалем «За адвагу».

Цяпер Мікалай Андрэевіч Варахобка жыве ў роднай вёсцы Лабачэва, працуе ў калгасе «Палітаддзелец».

ДАВц. Ф. 9742-п. Воп. 6. Спр. 45. Арк. 88.

Коля Варахобка

Гарачым летнім днём вайна дайшла і да в. Лабачова Бешанковіцкага раёна, дзе жыў Коля Варахобка, вучань шостага класа мясцовай школы. Пасля працяглых баёў хлопчыкі знайшлі некалькі пакінутых няспраўных самалётаў. З аднаго з іх Коля зняў кулямёт з патронамі і некалькі алюмініевых прапелераў, якія потым пераплавіў на сталовыя лыжкі. Гэтыя лыжкі пазней яму вельмі спатрэбіліся.
Калі сярод жыхароў вёскі пачаліся весціся размовы пра тое, што непадалёк у лясах дзейнічаюць партызаны, Коля вырашыў іх адшукаць. Пад выглядам продажу лыжак хлопчык два тыдні блукаў па вёсках, пакуль не апынуўся ў размяшчэнні партызанскага атрада “Марак” Дзмітрыя Коркіна, які і ўзяў яго ў атрад разведчыкам.
Неаднаразова хлопчыку прыходзілася з’яўляцца ў гітлераўскіх гарнізонах, а аднойчы нават удзельніцать у аперацыі па захопе нямецкіх афіцэраў – каштоўных “языкоў”.
За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў баях, Мікалай узнагароджаны медалём “За адвагу”.

# Мацней за смерць

## Арляняты

### МАЦНЕЙ ЗА СМЕРЦЬ

«Памалейка Марыя — 12 гадоў, сувязная з вёскі Дубінцы, аднесла падложнае пісьмо, і некалькі паліцэйскіх былі знішчаны самімі немцамі».

Гэта былі першыя звесткі аб піянерцы, выяўленыя ў справаздачы Чашніцкага падпольнага РК ЛКСМБ ад 1 ліпеня 1944 года.

Пошукі прывялі да тых, хто даваў дзяўчынцы гэта і іншыя заданні. Інструктар Чашніцкага падпольнага РК ЛКСМБ, а цяпер дырэктар Чашніцкай сярэдняй школы № 2 А. К. Непляховіч дапоўніў гэта лаканічнае паведамленне архіўнага дакумента. Вось што ён піша:

«Сапраўды, мной і інструктарам Чашніцкага падпольнага райкома партыі А. П. Кузьмічэнкам Марыя Памалейка была накіравана ў нямецкі гарнізон Чашнікі восенню 1943 года з падложным пісьмом. Яно было адрасавана Пушкову, які быў намеснікам камандзіра паліцэйскага атрада Новікава.

Пасля неаднаразовых спроб звязацца з Новікавым з мэтай пераходу яго атрада на бок партызан, ён працягваў карныя экспедыцыі, рабаваў і забіваў савецкіх людзей. Было вырашана знішчыць здрадніка рукамі немцаў. З гэтай мэтай было напісана падложнае пісьмо...

Даставіць пісьмо даручылі Марыі Памалейка, бо яна ведала Пушнова... Марыйка зрабіла вялікую справу. Немцы павесілі здраднікаў Пушкова і Новікава... Самае важнае, што ўвесь атрад, які налічваў каля 200 чалавек, перастаў існаваць».



Такое сур'ёзнае даручэнне дзяўчынцы далі не адразу і не выпадкова. Да ўказанага часу яна ўжо мела значны вопыт выканання розных партызанскіх заданняў, рэгулярна хадзіла ў варожыя гарнізоны. Адна або з маці неаднаразова бывала і ў Чашніках у аптэцы, дзе працаваў па заданню партызан Аўчыннікаў. Ён забяспечваў партызан медыкаментамі, перадаваў звесткі аб варожым гарнізоне.

Звесткі былі вусныя і пісьмовыя. Спісаныя дробным почыркам паперкі Марыйка ўплятала ў коскі, і ёй доўгі час удавалася шчасліва дастаўляць іх партызанам.

Аднойчы па даносу здрадніка Кляшчова (яго судзілі пасля вайны, і Марыя была сведкай на гэтым працэсе) дзяўчынка з маці была схоплена гітлераўцамі. Пры вобыску знайшлі запіску. Маці хутка адпусцілі, а Марыю забралі, разлічваючы, што застаўшыся без маці, яна спалохаецца і ўсё раскажа. Але вайна, работа ў падполлі навучылі маўчаць. І юная патрыётка не сказала ні слова. Тады пачаліся зверскія катаванні. Гітлераўцы патрабавалі назваць людзей і адрасы патрыётаў у Чашніках, з кім яна была звязана, месца размяшчэння партызанскага атрада, колькасць партызан.

Не вынесці б ёй усіх жудасных катаванняў, калі б партызаны не знайшлі спосаб вырваць яе з кіпцюроў смерці. Доўгі час яна была прыкавана да ложка. На целе не было жывога месца. Але, як кажуць, прага жыцця мацней за смерць.

Пасля вайны вучыцца Марыйцы не давялося. Працавала спачатку ў Прыбалтыцы, а апошнія 25 гадоў жыве ў Глыбокім, працуе ў сталовай. У Марыі Канстанцінаўны двое дзяцей. Дачка Рая, скончыўшы сярэднюю школу, паступіла ў прафесіянальна-тэхнічнае вучылішча № 19 г. Віцебска, сын — вучань 6-га класа.

Жыццё М. К. Памалейка — яркі прыклад для пераймання. Сям'я, савецкая школа выхавалі яе палымянай савецкай патрыёткай. У працы фарміраваўся і загартоўваўся характар школьніцы, умацоўвалася любоў да Радзімы. Усё гэта і дапамагло ёй выстаяць у цяжкую мінуту.

□ □

ДАВц. Ф. 9742-п. Воп. 6. Спр. 45. Арк. 88.

Марыя Памалейка

12-гадовая Маша з вёскі Дубінцы была адной з самых юных разведчыц, якую Чашніцкі падпольны РК ЛКСМБ накіраваў у нямецкі гарнізон Чашнікі восенню 1943 г. з падробленым лістом. Дзякуючы гэтаму лісту, некалькі паліцэйскіх, якія займаліся карнымі экспедыцыямі, былі знішчаны самімі немцамі.

Маша ўжо мела сур'ёзны вопыт выканання розных партызанскіх заданняў і рэгулярна хадзіла ў варожы гарнізон. Запіскі, адрасаваныя партызанам, Машанька ўплятала ў косы. А калі па даносе яе разам з маці схапілі гітлераўцы, не сказала ні слова, нават падчас катаванняў.

Смелы характар, адвага і сіла, загартаваныя ў цяжкай працы, толькі ўмацавалі любоў Марыі да Радзімы і дапамаглі ёй выстаяць з цяжкі час.

Пётр Логинов

# Праз лінію фронту

У ліку партызан атрада «Крэпасць» брыгады Аляксея была вялікая група вучняў Касплянскай школы былога Суражскага раёна на чале з яе дырэктарам П. П. Вішняковым. Сярод іх быў і чатырнаццацігадовы піянер Пеця Логінаў, ураджэнец вёскі Страгі.

Яго бацька яшчэ ў сакавіку 1942 года перайшоў з дапамогай партызан лінію фронту і ўступіў у рады Чырвонай Арміі.

Пеця стаў партызанам 10 кастрычніка 1942 года. Праходзіць курс ваеннай падрыхтоўкі не спатрэбілася: хлапчукі ваеннага часу добра валодалі зброяй. Таму, калі неўзабаве пачалася карная экспедыцыя, Пеця быў накіраваны ва ўзвод, які ўтрымліваў абарону на беразе ракі Касպля (прыток Заходняй Дзвіны) ля вёскі Храпуны на граніцы Віцебскай і Смаленскай абласцей.



У выніку цяжкіх баёў з карнікамі паявіліся раненыя, не хапала боепрыпасаў. Разам з групай партызан, выдзеленых камандаваннем брыгады, Пеця двойчы суправаджаў раненых за лінію фронту. Першы раз вярнуліся ў атрад без здарэнняў, прынеслі зброю і боепрыпасы, а другі раз праход на лініі фронту быў закрыты, і групу расфарміравалі. Ваеннаабавязаныя адразу ж папоўнілі рады Чырвонай Арміі, а Пеця Логінаў трапіў на фронт толькі ў снежні 1943 года. Там ён уступіў у камсамол, а ў 1946 годзе стаў членам партыі.

Першую баявую ўзнагароду — медаль «За баявыя заслугі» — атрымаў за вызваленне Латвіі, а ў сакавіку 1945 года быў узнагароджан ордэнам Славы III ступені. Гэта было пад Кенігсбергам. Фашысты рабілі ярасныя атакі з мэтай адкінуць нашы войскі ад Кенігсберга. На дапамогу наземным войскам прыйшлі авіяцыя і караблі праціўніка. Ішлі кровапралітныя баі. Адна з мінамётных батарэй 638-га стралковага палка 115-й стралковай дывізіі, у якой Логінаў быў наводчыкам, больш сутак вяла агонь па атакуючаму ворагу. Атака гітлераўцаў захліснулася, а неўзабаве Кенігсберг быў узяты. Юнага байца ўзнагародзілі ордэнам, а пазней і медалем «За ўзяцце Кенігсберга».

Затым былі новыя баі, баі цяжкія, амаль штодзённыя. Вайну Пеця закончыў у Памераніі. Там атрымаў яшчэ адну баявую ўзнагароду — медаль «За адвагу».

Пасля вайны скончыў 1-е Ленінградскае артылерыйскае вучылішча, стаў кадравым афіцэрам. У радах Савецкай Арміі знаходзіўся да ліпеня 1956 года.

Пасля дэмабілізацыі Пётр Іванавіч Логінаў быў на партыйнай рабоце, скончыў Мінскую Вышэйшую партыйную школу. Цяпер ён загадчык аддзела сацыяльнага забеспячэння выканкома Віцебскага раённага Савета народных дэпутатаў.

ДАВц. Ф. 9742-п. Воп. 6. Спр. 45. Арк. 89.

# Праз лінію фронту

<u>Пётр Логінаў</u>

Пеця Логінаў быў членам партызанскага атрада “Крэпасць” брыгады “Аляксея” , туды ж уваходзіла вялікая група вучняў Касплянскай школы былога Суражскага раёна, у якую хадзіў хлопчык.

Стаўшы партызанам, хлопчыку не спатрэбілася праходзіць курс ваеннай падрыхтоўкі, таму што ён ужо добра валодаў зброяй. Таму, калі пачаліся баі, Пеця быў накіраваны ва ўзвод, які ўтрымліваў абарону на беразе ракі Каспля каля вёскі Храпуны. Таксама Пётр двойчы суправаджаў раненых за лінію фронту. У першы раз вярнуўся ў атрад без здарэнняў, са зброяй і боепрыпасамі, а ў наступны вярнуцца не ўдалося, і ў снежні 1943 г. папоўніў рады Чырвонай Арміі.

Сваё першае баявое ўзнагароджанне – медаль “За баявыя заслугі”– атрымаў за вызваленне Латвіі. У сакавіку 1945 г. быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені. За ўдзел ва ўзяцці Кёнігсберга, дзе Логінаў быў наводчыкам у 638 стралковым палку 115-й стралковай дывізіі, юнак таксама атрымаў медаль.

# Поплеч з бацькам




## ПОПЛЕЧ З БАЦЬКАМ

Апанас Гурынавіч Шкабарын да Вялікай Айчыннай вайны працаваў сакратаром партыйнага камітэта Высокаўскага спіртазавода на Аршаншчыне.

Калі стала вядома, што гітлераўскія полчышчы ўварвуцца ў гэтыя месцы, А. Г. Шкабарын застаўся ў Оршы для работы ў партыйным падполлі. Пад яго кіраўніцтвам група савецкіх патрыётаў напярэдадні ўступлення гітлераўцаў у Оршу знішчыла Высокаўскі спіртазавод. Такім чынам, матэрыяльныя каштоўнасці не дасталіся ворагу.

Аб падпольнай рабоце бацькі з самага пачатку ведаў трынаццацігадовы сын Валодзя Шкабарын. Ды бацьку і не трэба было ўтойваць гэта ад Валодзі. Наадварот, бацька, ведаючы свайго сына як смелага і кемлівага хлопца, неўзабаве прыцягнуў Валодзю да актыўных баявых дзеянняў супраць фашысцкіх акупантаў і іх памагатых.

Валодзя добра ведаў аднаго з кіраўнікоў аршанскіх падпольшчыкаў, былога інструктара Аршанскага райкома партыі А. Т. Скавародку. Па яго заданню ён неаднаразова на падводзе вазіў міны, схаваныя то пад сенам, то пад вугалем ва ўказаныя падпольшчыкам месцы. Такім жа чынам ён перавёз радыёпрыёмнік. Валодзя не раз праязджаў праз гітлераўскія пасты, але ніколі не баяўся і заўсёды своечасова дастаўляў груз у месца прызначэння.

Восенню 1941 года Валодзя быў звязан яшчэ з адным падпольшчыкам — К. А. Дудчанкам. Пад яго кіраўніцтвам ён



выконваў адказныя і небяспечныя абавязкі сувязнога.

То на рынку ў Оршы, то ў іншых месцах вялікага скаплення людзей, дзе менш верагоднасці апынуцца ў полі зроку варожай разведкі, Валодзя сустракаўся з савецкімі патрыётамі і перадаваў ім вусныя і пісьмовыя заданні партыйнага падполля. Апрача гэтага, К. А. Дудчанка пазнаёміў Валодзю з савецкай разведчыцай-радысткай Верай, засланай у тыл праціўніка. Ён збіраў каштоўныя звесткі аб праціўніку, перадаваў Веры, а яна паведамляла іх камандаванню па рацыі.

Каб засцерагчы свае аб'екты ад дзеянняў савецкіх патрыётаў, фашысцкія ўлады размясцілі ў Оршы шэраг сваіх контрразведвальных органаў, у тым ліку і ГФП-709. Карнікам удалося натрапіць на след бацькі Валодзі Апанаса Гурынавіча. Ён быў схоплены гітлераўскай контрразведкай і па-зверску закатаваны ў яе засценках у маі 1942 года. Неўзабаве кіраўніцтву Аршанскага падполля паступілі сігналы аб тым, што гітлераўская контрразведка мае звесткі аб рабоце іншых савецкіх патрыётаў, у тым ліку і Валодзі.

Каб пазбегнуць правалу, па камандзе кіраўнікоў падполля Валодзю, К. А. Дудчанку і разведчыцы-радысткі Веры было прапанавана пайсці ў партызанскі атрад імя Варашылава.

Разам са сваімі старэйшымі баявымі сябрамі-партызанамі Валодзя не раз удзельнічаў у баявых аперацыях, помсціў ворагу за пакутніцкую смерць бацькі, адважнага камуніста, палымянага патрыёта Айчыны.

У спісе актыўных барацьбітоў першай групы Аршанскага партыйна-патрыятычнага падполля імя юнага піянера Валодзі Шкабарына стаіць на другім месцы пасля бацькі Апанаса Гурынавіча, які загінуў смерцю храбрых ад рук фашысцкіх катаў.

За баявыя заслугі Валодзя ўзнагароджан медалем «Партызану Айчыннай вайны» II ступені.

Да вайны Валодзя скончыў 6 класаў Высокаўскай школы на Аршаншчыне. У пасляваенныя гады Уладзімір Апанасавіч Шкабарын каля дзесяці гадоў служыў у Савецкай Арміі. І на мірным фронце ён працуе таксама самаадлана, як і ў час свайго гераічнага юнацтва.

За высокія паказчыкі ў працы ён узнагароджан ордэнам Леніна, а таксама залатым медалем Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі СССР. Жыве ў Гомелі, працуе расточнікам на адным з заводаў.

ДАВц. Ф. 9742-п. Воп. 6. Спр. 45. Арк. 93.

<u>Валодзя Шкабарын</u>

Да Вялікай Айчыннай вайны Апанас Гурынавіч Шкабарын працаваў сакратаром партыйнага камітэта Высокаўскага спіртзавода на Аршаншчыне. Падчас вайны застаўся ў Оршы для працы ў падполлі.

Да актыўных баявых дзеянняў супраць фашыстаў быў прыцягнуты і сын Шкабарына Валодзя, які нярэдка падвозіў міны ў названыя падпольшчыкамі месцы, сустракаўся з савецкімі патрыётамі і перадаваў ім вусныя або пісьмовыя заданні партыйнага падполля.

У спісе актыўных змагароў першай групы Аршанскага партыйна-патрыятычнага падполля імя Валодзі стаіць побач з імем яго бацькі, Апанаса Гурынавіча, які быў закатаваны фашыстамі ў маі 1942 г.

Каб пазбегнуць арышту, Валодзя перейшоў ў партызанскі атрад імя Варашылава.

Разам со сваімі баявымі сябрамі-партызанамі не раз удзельнічаў у баявых аперацыях, помсціў ворагу за пакутніцкую смерць свойго бацькі, палымянага патрыёта Айчыны.

За баявыя заслугі Уладзімір узнагароджаны медалём “Партызану Вялікай Айчыннай вайны II ступені”.

